Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
18 ЛІСТАПАДА 2016 г. ПЯТНІЦА № 223 (28333)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Эх, пракачу бабулю… у ночвах
СТАР. 5



Місія невыканальная: знайсці тэатр без гаджэта
СТАР. 13

# У ФАРМАЦЕ ШЧЫРАГА ДЫЯЛОГУ

## На пытанні расійскіх журналістаў Аляксандр Лукашэнка адказваў амаль шэсць гадзін




Фота БЕЛТА.

### Аб рэгіянальным супрацоўніцтве і кааперацыі

Прэзідэнт адзначыў, што важнейшым напрамкам інтэграцыі Беларусі і Расіі з'яўляецца рэгіянальнае супрацоўніцтва. «Калі б не рэгіянальнае супрацоўніцтва, мы сёння тут з вамі не знаходзіліся б і не гаварылі б аб тым, што мы брацкія народы. Менавіта рэгіёны Расійскай Федэрацыі выратавалі брацтва дзвюх славянскіх дзяржаў».

Асаблівую ўвагу беларускі лідар звярнуў на Форум рэгіёнаў, які праходзіў у чэрвені ў Мінску з удзелам Прэзідэнтаў дзвюх краін. На ім падпісалі рэкордную колькасць пагадненняў, дагавораў, камерцыйных кантрактаў на $300 млн.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што вытворчай кааперацыяй звязаны больш як 8 тысяч прадпрыемстваў абедзвюх краін. На тэрыторыі Расіі створана звыш 70 сумесных вытворчасцей беларускай тэхнікі. Расійскія кампаніі таксама рэалізуюць шэраг буйных праектаў у Беларусі. Напрыклад, яны заняты на будаўніцтве Беларускай атамнай электрастанцыі.

У Магілёўскай вобласці фірма з Омска разгортвае магутнасці па вытворчасці тэхнічнага вугляроду. У Гомельскай — група расійскіх кампаній стварыла завод па выпуску пранікаючай гідраізаляцыі. Сумесна з прадпрыемствамі Ленінградскай вобласці ў Беларусі ствараюцца лагістычны цэнтр, жывёлагадоўчы комплекс малочнага напрамку.

СТАР. 2-4

**Правядзенне прэс-канферэнцыі Прэзідэнта Беларусі для расійскіх журналістаў можна назваць ужо добрай традыцыяй — учора яна праходзіла трынаццаты раз. Зноў жа па традыцыі гэтаму мерапрыемству папярэднічаў прэс-тур — сёлета расійскія журналісты знаёміліся з сацыяльна-эканамічным развіццём Магілёўскай вобласці. А ўчора прадстаўнікі СМІ і блогасферы з 46 рэгіёнаў Расіі задавалі свае пытанні кіраўніку беларускай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адказваў на іх амаль шэсць гадзін.**

**«Галоўная мэта такіх сустрэч — збліжэнне нашых народаў, магчымасць данесці аб'ектыўную інфармацыю аб самай блізкай і, спадзяюся, самай роднай для вас зямлі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Расійская Федэрацыя для нас таксама была і застаецца не проста стратэгічным партнёрам і саюзнікам, а блізкай і брацкай дзяржавай».**

**Мерапрыемства прайшло ў фармаце давернага дыялогу, да якога кіраўнік дзяржавы заклікаў у самым пачатку сустрэчы. Расійскія журналісты і блогеры падрабязна дзяліліся сваімі ўражаннямі аб убачаным у прэс-туры па Магілёўскай вобласці, а таксама цікавіліся меркаваннем Прэзідэнта па шырокім спектры пытанняў: ад расійска-беларускага супрацоўніцтва і развіцця Беларусі да яго асабістых спартыўных і літаратурных схільнасцей.**



## ■ Прамая лінія

### УСЁ, ШТО ХВАЛЮЕ ЖЫХАРОЎ СЛАЎГАРАДЧЫНЫ

У гэтую суботу, **19 лістапада, адбудзецца сумесная «прамая тэлефонная лінія» старшыні Слаўгарадскага райвыканкама Паўла Найдзёна і рэдакцыі газеты «Звязда»**. Нагадваем, што **лінія працуе з 9.00 да 12.00 па тэлефоне 8(02246) 79625**. Усе хвалюючыя вас пытанні і тое, як яны вырашаюцца, знойдуць адлюстраванне на старонках нашага выдання.

Газета «Звязда», як заўсёды, застаецца вашым верным сябрам і карысным дарадчыкам. Практыку правядзення сумесных «прамых ліній» з кіраўнікамі мясцовай улады мы будзем працягваць і надалей.

## ■ Надвор'е

### ЛІСТАПАДАЎСКАЯ АДЛІГА

**На гэтым тыдні на змену маразам прыйшлі цёплыя атмасферныя франты, якія змяшчаюцца з боку паўднёвага захаду Еўропы, паведамляе галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

У найбліжэйшыя дні на тэрыторыі Беларусі будзе цяплей, але ветрана і сыра.

Прагназуецца, што ў суботу ўначы ў асобных раёнах і ўдзень пераважна па паўночным захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай па паўночным усходзе краіны па дарогах захаваецца галалёдзіца. Усталюецца паўднёвы парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 1 мароза на ўсходзе да 5 цяпла на захадзе краіны, удзень тэмпература павялічыцца да 2—8 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 10 градусаў. У нядзелю невялікія кароткачасовыя дажджы чакаюцца толькі ў асобных раёнах. Уначы і раніцай захаваецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да 6 цяпла, удзень — плюс 2—9 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ■ Спадчына ў законе

# СВОЕЧАСОВАЯ ПАДТРЫМКА

**Днямі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне аб фінансавай падтрымцы некаторых устаноў культуры і мастацтва. Частка гэтых сродкаў будзе выдзелена і на рэстаўрацыйныя работы. Агульная сума ўкладанняў у культуру складзе больш за Br500 тыс.**

Грашовыя сродкі, у прыватнасці, выдзеляць Нацыянальнаму Полацкаму гісторыка-культурнаму музею-запаведніку на рэстаўрацыю і падрыхтоўку да экспанавання алейных роспісаў XVIII—XIX стагоддзяў Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку. Даведаўшыся пра гэту добрую навіну, там адразу распачалі работы.

— Работа над алейнымі роспісамі XVIII—XIX стагоддзяў вядзецца па асаблівай рэстаўрацыйнай тэхналогіі, — расказала карэспандэнту «Звязды» **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Полацкага музея-запаведніка Таццяна ЯВІЧ**. — У 2014 годзе самыя верхнія роспісы былі адслоены ад больших старых малюнкаў і перанесены на часовую аснову. Аднак у такім стане яны захоўваліся б яшчэ паўгода-год, а далей пачаўся б працэс разбурэння, і яны маглі быць страчаны. Дзякуючы аказанай фінансавай падтрымцы алейныя росписы будуць ачышчаны ад часовай асновы і перанесены на новую, зафіксаваны спецыяльнымі хімічнымі элементамі. У завершаным выглядзе іх перанясуць у музейную экспазіцыю.

Нагадаю, што алейныя росписы XVIII—XIX стагоддзяў, пра якія расказала спецыяліст, былі знятыя са Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку, бо пад імі знайшлі ўнікальныя фрэскі XII стагоддзя. Мяркуецца, што гэтыя фрэскі, зробленыя па сырой тынкоўцы, маглі быць створаны пад непасрэдным кіраўніцтвам самой Еўфрасінні Полацкай.



Полацкая Спаса-Праабражэнская царква.

Таксама, згодна з распараджэннем Прэзідэнта, фінансавую падтрымку акажуць Віцебскаму цэнтру сучаснага мастацтва — на стварэнне новай інтэрактыўнай экспазіцыі музея Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. Яе прымяркуюць да 130-годдзя з дня нараджэння Марка Шагала, якое будзе адзначацца налета.

Падтрымку акажуць Дзяржаўнаму ансамблю танца для стварэння і паказу канцэртнай праграмы «Спадчына» ў межах міжнароднай культурнай акцыі «Беларускі дзень». Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» атрымае фінансаванне для стварэння архіўных копій фільмаў «залатой калекцыі» беларускага кінематографа, якую ў будучыні плануецца прадставіць шырокаму колу гледачоў Беларусі.

Грашовыя сродкі выдзеляць Гомельскаму дзяржаўнаму цырку на мадэрнізацыю светлавога абсталявання. Такое абнаўленне будзе адбывацца ў межах падрыхтоўкі да Першага фестывалю цыркавога мастацтва Саюзнай дзяржавы ў 2017 годзе. Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча атрымае фінансаванне на правядзенне майстар-класаў і фінальнага канцэрта рэспубліканскай акцыі «Харавое веча».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

ISSN 1990 - 763X

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)*

Беларускія прадпрыемствы па лініі кааперацыі даюць работу мільёнам расіян, заявіў Прэзідэнт. На расійскіх прадпрыемствах вырабляецца да 50—60 працэнтаў камплектуючых для беларускіх заводаў. «Прамысловасць, сельская гаспадарка — гэта такі вялікі кавалак, які дае магчымасць мінімум 10 млн расіян працаваць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## Аб праблемах, якія трэба вырашаць

Гэты год не з'яўляецца лепшым у развіцці беларуска-расійскага супрацоўніцтва, адзначыў Прэзідэнт. «Што датычыцца эканомікі, вы цудоўна разумееце, што адбылося. Мы вельмі залежым ад расійскага рынку, асабліва па пастаўках сыравіны і энергарэсурсаў», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. На расійскім рынку здарыўся сур'ёзны абвал, была дэвальвавана нацыянальная валюта, у сувязі з чым за апошні час абодва бакі панеслі сур'ёзныя страты, значна знізіўся тавараабарот. «Адзіная светлая пляма ва ўсім гэтым — тое, што фізічныя аб'ёмы тавараабароту і паставак Беларусі ў Расію не зменшыліся, у фізічных аб'ёмах мы прырастаем, але тавараабарот мы лічым у доларавым эквіваленце. Тут у нас асабліва хваліцца няма чым», — канстатаваў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, сустракаючыся з гэтым годзе з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным і ў рамках Саюзнай дзяржавы, і ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, кіраўнікі дзяржаў неаднаразова абмяркоўвалі гэту тэму, і яна ўжо стала выклікаць не тое што нейкую насцярожанасць, але нават раздражняльнасць з-за таго, што «мы не можам ужо які год выйсці з гэтага піке і аднавіць нашу эканоміку». «Як у вас, так і ў нас у гэтым годзе валавы ўнутраны прадукт падае. Зноў жа, у грашовым выражэнні, — таму што Беларусь выраблць менш не стала, але, на жаль, і багацей мы ад гэтага не сталі. Вось такі фон, і ён яшчэ пагаршаецца сітуацыяй, якая складваецца ў свеце, яна няпростая. На гэтым фоне мы ў гэтым годзе спрацавалі не лепш, чым у мінулым, і тым больш — у папярэднія гады, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Паглядзім, як будзе складвацца сітуацыя, таму што, калі абсалютна сумленна, нам вельмі шмат трэба будзе зрабіць, каб працаваць нармальна».

Гаворачы аб недахопах у эканамічным супрацоўніцтве, у тым ліку ў інтэграцыйных аб'яднаннях, удзельнікамі якіх з'яўляюцца Расія і Беларусь, Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў асноўным краіны-партнёры, калі сутыкаюцца з цяжкасцямі, пачынаюць абараняцца, замест таго, каб шукаць выхад з сітуацыі ў сумесных дзеяннях. «Пачынаем адасабляцца, замыкацца ў сваіх нацыянальных рамках, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Думаю, гэта няправільна, асабліва для Беларусі і Расіі. У нас узаемадапаўняльныя эканомікі, яны не канкуруюць па многіх напрамках адна з адной, і нам няма чаго адзін ад аднаго абараняцца».

На наступным тыдні запланавана сустрэча кіраўнікоў Беларусі і Расіі, паведаміў Аляксандр Лукашэнка. «У нас яшчэ вельмі шмат праблем, якіх не павінна быць, якія засмучаюць часам нашы адносіны. Таму я таксама часта думаю, што добрага мы зрабілі, новага (у Саюзнай дзяржаве. — **Заўвага БЕЛТА**). На жаль, нічога добрага не зрабілі. Больш у нас негатыва, таму мы дамовіліся з Прэзідэнтам Расіі, што, напэўна, 22 лістапада мы сустрэнемся. Сядзем удваіх і абмяркуем некаторыя прынцыповыя пытанні», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што размова не ідзе аб канцэптуальных пытаннях. «Мы ўжо вызначыліся па ўсіх пытаннях, трэба проста выконваць нашы дамоўленасці. Прэтэнзіі і да нас, і да Расійскай Федэрацыі. Але мы сядзем і сам-насам абмяркуем гэтыя пытанні. І дамовімся, пастараемся надаць новы імпульс нашым адносінам», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## Пра беларускія прадукты і сельгастэхніку

Адказваючы на адно з апытанняў, Прэзідэнт звярнуў увагу на няроўныя ўмовы для суб'ектаў гаспадарання ў Беларусі і Расіі. Аляксандр Лукашэнка ў якасці прыкладу прывёў расклад па сабекошце прадукцыі беларускага і расійскага прадпрыемстваў МАЗ і КамАЗ. Так, КамАЗ спажывае прыродны газ па цане $65 за 1 тыс. куб. м, МАЗ — па $278, электраэнергію — 2,8 цэнта і 12 цэнтаў адпаведна. «Як канкураваць, калі для суб'ектаў гаспадарання апошнім часам створаны няроўныя ўмовы? Перакос вельмі вялікі», — сказаў беларускі лідар. «Хоць мы дэкларавалі выхад на роўныя ўмовы, але пакуль гэтага няма, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — І мы людзям тлумачым, што не можам проста падняць заработную плату нават пры нашых жорсткіх эканамічных разліках».

Адказваючы на пытанне, якое датычылася якасці беларускай сельгастэхнікі, навучання і падрыхтоўкі кадраў для работы на ёй, Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што разбярэцца з пытаннямі яе паставак і эксплуатацыі ў Расіі. Там беларуская тэхніка часта прадаецца праз трэція рукі, адзначыў Прэзідэнт. «Вы гаворыце, што вялікая колькасць людзей прадае гэту тэхніку, але яны не заўсёды абслугоўваюць яе», — сказаў ён.

Што датычыцца прадуктаў харчавання — Беларусь гатова пастаўляць іх неабходныя аб'ёмы ў Расію па выгадных цэнах, запэўніў Прэзідэнт. «Для нас расійскі рынак цяпер, можна сказаць, прэміяльны. Кіраўніцтва Расіі, асабліва ў гэты час, асенне-зімовы перыяд, просіць павялічыць пастаўкі. Мы нават здымаем з іншых рынкаў, каб забяспечыць прадуктамі сельскай гаспадаркі расіян», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што беларуская прадукцыя запатрабавана, прадстаўлена ў розных рэгіёнах свету, у тым ліку ёсць зацікаўленасць з боку Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Прадстаўнікі расійскіх рэгіёнаў могуць звярнуцца да любога вытворцы.

«Галоўнае, без пасрэднікаў, як у вас прынята. Пяць жулікаў да пастаўшчыка — якая цана будзе? Але гэта вашы справы, як вы там гандлюеце», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што калі ёсць жаданне закупляць беларускія тавары, канкурэнтныя па якасці і цане, то Беларусь гатова задаволіць попыт на іх.

## Пра «нафтавыя» адносіны

Адказваючы на пытанне, што перашкаджае Беларусі вярнуцца да нафтараспрацовак на тэрыторыі Расіі, як гэта было ў гады СССР, Аляксандр Лукашэнка растлумачыў: пазіцыя расійскага кіраўніцтва. «А як потым уплываць на Беларусь, калі яна сама будзе нафту здабываць, а потым яшчэ і прыродны газ?» — адзначыў кіраўнік дзяржавы, падкрэсліўшы, што ўплываць на Беларусь з дапамогай нафтагазавых пытанняў — няправільна. «Можна ўплываць, але лепш уплываць такім чынам, каб у нас былі агульныя праекты. Каб гэта былі праекты, якія прыцягваюць Беларусь да Расіі, не нахіляюць, а прыцягваюць. Свет зусім іншы, гэта не той свет, калі можна было нахіліць», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь разглядае розныя варыянты паставак нафты ў краіну. «Сёння нафты — бяры не хачу. Так, можа, даражэй будзе, але мы разглядаем некалькі варыянтаў. Дапусцім, пастаўку праз Украіну, а такая магчымасць ёсць, мы ж не некалі задзейнічалі, калі вы перасталі нам пастаўляць нафту. Мы венесуэльскую нафту ўзялі і пастаўлялі праз Украіну. Проста на расійскі рынак тады прыйдзе іншая нафта: усё ж такі 25 млн тон мы перапрацоўваем, і праз нас на захад ідзе па 60—80 млн тон расійскай нафты. Можна ж выпрацаваць баланс інтарэсаў і дамовіцца? Трэба, але пакуль не дамовіліся», — адзначыў ён.

«Расіяне часта крытыкуюць нас: «Лукашэнка не хоча прыватызаваць чатыры прадпрыемствы», — расказаў Прэзідэнт. «У вас ёсць інтарэс да гэтых прадпрыемстваў, вы хочаце іх выкупіць. У мяне ёсць інтарэс да здабычы нафты: каб не 25 млн тон, якія мы перапрацоўваем у Беларусі, але 7—8 млн тон мы маглі здабываць самі і пастаўляць у краіну. І калі была прыватызацыя «Башнафты», я накіраваў прапановы вашаму ўраду і кіраўніцтву. Давайце, беларусы зразумеюць, калі мы гэтыя прадпрыемствы з умовай, што яны будуць працаваць лепш, чым сёння, абмяняем на акцыі «Башнафты», якія вы «Раснафце» перадалі або прадалі. Да гэтага часу адказу няма, значыць, не хочуць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Але час нафты і газу адыходзіць, будучыня — за найноўшымі тэхналогіямі, рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. Беларусь, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, укараняе высокія тэхналогіі ва ўсе сферы жыцця, развіваючы атамную энергетыку, касмічныя тэхналогіі. «Яны ў нас і ў ахове здароўя, і ў адукацыі — усюды», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы ўпамянуў, у прыватнасці, унікальную аперацыю, якую правялі нядаўна беларускія хірургі па перасадцы комплексу «сэрца—лёгкія». «Усюды мы патроху робім штосьці новае, каб на ім выхоўвалася будучыня», — сказаў Прэзідэнт.


Фота БЕЛТА.

## Пра ролю і будучыню Саюзнай дзяржавы

«Ужо цяпер беларуска-расійскія адносіны маюць магчымасць выйсці на якасна новы ўзровень і даць чарговы штуршок хутчэйшаму станаўленню Еўразійскага эканамічнага саюза, — заявіў Прэзідэнт. — Падкрэслю, што асновай для яго стварэння стала менавіта Саюзная дзяржава. Пры ўсім маштабе мэт і задач, якія адлюстраваны ў Дагаворы аб стварэнні ЕАЭС, гэтаму інтэграцыйнаму аб'яднанню па шэрагу напрамкаў яшчэ трэба будзе падняцца да ўзроўню нашага з вамі Саюза».

Беларускі лідар адзначыў, што грамадзяне абедзвюх краін прывыклі ўжо да адсутнасці граніц паміж дзвюма дзяржавамі, аднолькавага доступу да адукацыі, паслуг аховы здароўя, адзіных падыходаў да сістэмы сацыяльных гарантый, бесперашкоднага працаўладкавання, свабоды перамяшчэння і выбару месца жыхарства.

«Нашы моцныя саюзніцкія адносіны нязменна праяўляюцца і на міжнароднай арэне, дзе мы сутыкаемся з новымі пагрозамі і выклікамі. Сёння планету трасе ад міжусобіц, тэрарызму і ваенных канфліктаў. Не раз абмяркоўваючы гэтыя пытанні з Прэзідэнтам Расіі, мы дэманстравалі ў іх ацэнцы поўную згоду. Разыходжання па міжнароднай парадку дня ў абедзвюх дзяржаў няма. І невыпадкова, калі размова ідзе аб ключавых пытаннях міжнароднай палітыкі, Беларусь і Расія выступаюць адзіным фронтам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У гэты няпросты час, выказаў упэўненасць Прэзідэнт, беларусам і расіянам трэба трымацца разам. Быць моцнымі, умець прымусіць лічыцца з сабой, разам адстойваць свае інтарэсы. «У нас ёсць ні з чым не параўнальная каштоўнасць — мір і згода ў доме. Усімі сіламі мы абавязаны берагчы гэты здабытак. Каб за спакойнае жыццё людзей не даваліся плаціць крывёй, як гэта адбываецца ў многіх мясцінах. На вялікі жаль, і ў вельмі блізкай і роднай нам Украіне. У нас з вамі агульны боль, агульная слава, агульная будучыня. І вы ніколі не будзеце ў Беларусі чужымі», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што для стварэння Саюзнай дзяржавы зроблена ўжо шмат. «Вось вы да нас прыехалі, просты прыклад, і вас ніхто на граніцы не спыніў, пашпарт не патрабаваў, візу вы не афармлялі. У нас рух людзей, рабочай сілы ды і капіталу абсалютна свабодны. Любы расіянін можа прыехаць у любое месца ў Беларусі, а любы беларус — у любое месца ў Расіі і быць як дома», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «У большасці выпадкаў мы працуем па адзіных нормах, правілах і законах. Акрамя таго, мы навучыліся абараняць сваю Айчыну, як мы часта гаворым, у Беларусі мы толькі так гэта разумеем, адзінымі ўзброенымі сіламі. Вы ведаеце, што ў рамках Дагавора аб калектыўнай бяспецы, а яшчэ раней — па дагаварах і пагадненнях з Расіяй, мы тут, на заходнім напрамку, у альтэрнатыву НАТА стварылі адзіную беларуска-расійскую групоўку, аснову якой складае 70-тысячная армія Узброеных Сіл Беларусі. Гэта, па прызнанні натаўцаў, лепшая ў СНД абучаная і добра ўзброеная армія, якая сёння знаходзіцца наперадзе, на перадавым фронце, як раней гаварылі, і абараняе нашы сумесныя рубяжы», — расказаў Прэзідэнт.

Гаворачы аб ахове здароўя і адукацыі, Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў абедзвюх краінах практычна адзіныя стандарты. «Няма ніякіх праблем, вы можаце прыязджаць да нас на лячэнне, мы можам ехаць у Маскву, Санкт-Пецярбург або любы іншы горад. Папросту можам атрымліваць адукацыю, у нас створана некалькі сумесных універсітэтаў. У нас амаль аднолькавыя праграмы сярэдняй школы, ды і ў ВНУ таксама, асабліва па гуманітарных дысцыплінах. А дзе-нідзе мы нават апярэджваем вас у плане патрыятычнага выкладання таго ці іншага матэрыялу, у нас не было такіх «шараханняў», як мы назіралі ў Расіі ў плане вывучэння айчыннай гісторыі. Мы ніколі «пад ногі не кідалі» гісторыю, не знішчалі помнікі, не пераймяноўвалі вуліцы — так было ў гісторыі нашай краіны, значыць, так павінна застацца. Жыццё з цягам часу ўсё расставіць на свае месцы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Зроблена нямала, але ёсць пэўнае тармажэнне, і за гэта мы атрымліваем з вашага боку крытыку, але гэтаму ёсць і аб'ектыўныя прычыны. Вельмі рамантычныя мы, напэўна, былі 20 гадоў таму, а калі пачалі прапрацоўку канкрэтных пытанняў, то аказалася — усё не так проста. З'явілася шмат груп уплыву, ды і ў дзяржаў з'явіліся нейкія рознагалоссі. Спадзяюся, што нам удасца, можа, не ў самы бліжэйшы час, а ў сярэднетэрміновай перспектыве, у гэтым напрамку зрабіць дадатковыя крокі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Адказваючы на пытанне, на якія сферы развіцця супрацоўніцтва Беларусі і Расіі трэба звярнуць асаблівую ўвагу, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў першую чаргу гэта сферы, якія звязаны са звычайным жыццём людзей. «Пасля і астатнія пытанні — і космас, і абарону, і ВПК — будзем вырашаць паступова. Людзі есці хочуць кожны дзень, яны хочуць карміць сваю сям'ю, сваіх дзяцей, яны павінны быць цёпла апранутыя зімой. Над гэтым мы павінны працаваць, бачачы, вядома, і стратэгічныя пытанні», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## Пра зарплаты і камунальныя паслугі

Кіраўнік дзяржавы прывёў статыстычныя даныя па сярэдняй заработнай плаце ў Расіі і Беларусі і суаднёс гэтыя паказчыкі з коштам паслуг. Так, цяпер зарплата работнікаў у Беларусі набліжаецца да $400, у Расіі яна ў паўтара раза большая. Але пры гэтым за жыллёва-камунальныя паслугі насельніцтва Беларусі плаціць значна менш, чым у Расіі, Украіне, еўрапейскіх краінах. У прыватнасці, аплата за кубаметр вады ў Мінску — 15 цэнтаў (у рэгіёнах рэспубліці — яшчэ ніжэй), а ў Маскве — 53 цэнты, у Санкт-Пецярбургу — 41 цэнт, у Смаленску — 36 цэнтаў, у Кіеве — 27 цэнтаў, у Берліне — $2,5.

# ШЧЫРАГА ДЫЯЛОГУ

Прыблізна такая ж карціна і з коштам для насельніцтва іншых ЖКП (па каналізацыі, гарачым водазабеспячэнні, цеплазабеспячэнні, тэхнічным абслугоўванні, за карыстанне ліфтам). Акрамя таго, у Беларусі захоўваецца бясплатная адукацыя (амаль 90 працэнтаў студэнтаў ВНУ навучаюцца за кошт бюджэту), ахова здароўя.

«Можна чалавеку даць двайную зарплату, але забраць праз пэўныя паслугі. І што чалавек за гэту зарплату зможа купіць — пытанне», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што і прадукты ў Беларусі былі б значна таннейшыя, «калі б не падганяў расійскі рынак».

Беларусь у наступным годзе дасягне ўзроўню сярэдняй зарплаты $500, запэўніў Прэзідэнт. Аднак для павышэння заработнай платы неабходны рост прадукцыйнасці працы. «Прадукцыйнасць працы перш за ўсё, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Няма прадукцыйнасці працы — якая зарплата? Але трэба і прыватныя, і дзяржаўныя бізнес і кампаніі падштурхоўваць, каб яны займаліся гэтым пытаннем».

Гаворачы пра сферу ЖКГ, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Лічу, што нельга гэту сферу, прынамсі цяпер і ў бліжэйшым будучым, падзяліць на кускі і прыватызаваць. Там бізнес не атрымае жаданых вынікаў, калі працаваць сумленна і пад кантролем, а тое, што трэба пад кантролем трымаць усе гэтыя праблемы, мы добра разумеем, таму што гэта датычыцца кожнага — і журналіста, і настаўніка, і ўрача», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт канстатаваў, што Беларусь не пайшла па шляху прыватызацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, а пачала ўдасканальваць сістэму. Была створана рабочая група, якая пачала займацца разлікам кошту паслуг. «Мы вылічылі сярэднюю цану, і я ўказам зацвердзіў кошт паслуг. І ніхто, акрамя Прэзідэнта, гэта змяніць не можа. Калі раней людзі пакрывалі 30 працэнтаў кошту паслуг ЖКГ, а 70 працэнтаў кампенсаваў бюджэт, то адразу пасля гэтых разлікаў аказалася, што насельніцтва пакрывае 52 працэнты. Амаль у два разы. А ўявіце, што ў вашых прыватніках творыцца, хто іх кантралюе?» — сказаў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка не выключыў змянення зацверджанага кошту, але калі гэта і будзе зроблена, то на падставе дакладных разлікаў з улікам сітуацыі.

«МВФ патрабуе — сёння 75 працэнтаў, а заўтра 100 працэнтаў павінна насельніцтва плаціць за паслугі ЖКГ, тады яны дадуць крэдыт. Добра, сёння 100 працэнтаў зробім, а заўтра будуць дзікія неплацяжы, людзі проста не змогуць заплаціць. І гэтым самым пачнём знішчаць тых, хто аказвае паслугі. Таму тут трэба ісці вельмі акуратна», — лічыць Прэзідэнт.

Ён нагадаў аб рашэнні кожны год паднімаць кошт ЖКП не больш як на $5 у эквіваленце. «У будучым годзе я дакладна ведаю, і народ ведае, што жыллёва-камунальныя паслугі падаражэюць на $5. Тады будзе не 52 працэнты, а можа, 58 працэнтаў пакрыцця. І вось так павольна мы будзем ісці. І калі раптам адбудзецца нейкі нечаканы абвал, інфляцыя вырасце і іншае, мы палічым, і Прэзідэнт указам зацвердзіць. І ніякага шарлатанства тут быць не павінна і не будзе», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама кіраўнік дзяржавы расказаў, што на прыкладзе Мінска адпрацоўваецца новая сістэма жыллёва-камунальнай гаспадаркі. «Мы ў немцаў нешта падгледзелі, у іншых. Бачым, што ў немцаў паслугі па некалькіх дамах аказвае хаус-майстар — адзін прафесійны чалавек, кожны чалавек у доме ведае, у каго запытаць. Ён адказвае за гэты дом. Цяпер мы вядзём гэту рэформу, паглядзім, што атрымаецца, і распаўсюдзім некаторыя элементы на ўсю краіну. Трэба выпрацаваць сістэму і парадак», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## Аб навядзенні парадку ў эканоміцы

«У нас шарлатанства ў эканоміцы няма, мы лічым кожную капейку», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Калі дазволіць шарлатанству і некаму набіваць кішэні, то людзі на прадпрыемствах застануцца без работы.

«Як складваецца сёння ў эканоміцы сітуацыя, так мы і жывём. Хоць калі ўзяць у цэлым сацыяльны пакет, то мы абсалютна не горш жывём, чым іншыя», — адзначыў Прэзідэнт.

«Мы не скінулі праблемы на плечы людзей. Калі падняць зарплату і скінуць на іх і ЖКП, і адукацыю, і ахову здароўя, то людзі не выцягнуць. Мы на гэта пайсці не можам», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

«У краіне крызіс, у Расіі крызіс. Давайце паглядзім, як жывуць банкіры. Нядрэнна жывуць, лепш, чым у мінулыя гады, нягледзячы на крызіс. У тым ліку па зарплаце, крэдыты самі сабе выдаюць. У бліжэйшы час мы навядзём там жалезны парадак», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## Аб рэформах у сельскай гаспадарцы і амнісцыраваных экс-чыноўніках

Аляксандр Лукашэнка выступае супраць бяздумных рэформ у сельскай гаспадарцы. «Мы штучна, агулам, як вы зрабілі некалі, не разбураем ні сельскую гаспадарку, ні прамысловыя прадпрыемствы, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Калі, дапусцім, ёсць добры прыватнік, які гатовы ўзяць калгас, саўгас па-старому, калі ласка. І ў нас ужо амаль чвэрць сельскай гаспадаркі прыватная. Але мы яе на кавалкі не парэзалі, як у вас у некаторых месцах».

Трэба прыкладна 15 тысяч гектараў, каб прымяніць энерганасычаную тэхніку, атрымліваць нармальны прыбытак і ўпэўнена адчуваць сябе на рынку. «Якая будзе акупнасць, рэнтабельнасць на 10 гектарах? Ніякай!» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — І калі б мы падзялілі на кускі гэту зямлю, мы проста яе загубілі б, яна зарасла б бур'янам. А мы цалкам, калі ёсць жадаючыя, прадавалі гэты калгас. Прытым за малыя грошы. Дарэчы, расіяне многія купілі латыфундыі ў Беларусі».

«Нельга тут бяздумна ажыццяўляць гэтыя рэформы і праводзіць агулам. Трэба гэта рабіць акуратна, разумна, і на пульсе трымаць руку, каб не было карупцыі і несправядлівасці», — яшчэ раз падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

А ў стратныя калгасы ў Беларусі адправілі працаваць амнісцыраваных экс-чыноўнікаў, расказаў Прэзідэнт. «У нас пакаранне няслабае карупцыянерам. Гэта таксама вельмі важна, яны павінны ведаць, што будуць сядзець, і нямала», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Між тым Прэзідэнт мае права правесці амністыю і выпусціць чыноўнікаў, якія праштрафіліся, на волю, тым самым даўшы ім шанц на выпраўленне. Так, паводле яго слоў, нядаўна ў Беларусі быў праведзены эксперымент, па выніках якога амнісцыравалі групу чыноўнікаў і накіравалі іх працаваць у стратныя калгасы-саўгасы. «А чаго карміць іх у турме? Ідзіце, паказвайце сябе», — сказаў беларускі лідар.

«Сёння працуюць. Нават намеснік генеральнага пракурора (былы), — канстатаваў Прэзідэнт. — Гэта адзін з такіх, пайшоў старшынёй калгаса, працуе. У канцы года мне даложаць па ўсім спісе, як яны спрацавалі».

## Аб сумленным вядзенні спраў

Прэзідэнт запрашае замежны бізнес працаваць у Беларусі, але па правілах. «У нас ёсць пэўныя ўмовы, пэўныя абмежаванні, усе павінны разумець, што яны прыйшлі не ў чыстае поле, дзе вецер гуляе, — растлумачыў сваю пазіцыю кіраўнік дзяржавы. — У нас цывілізаваная краіна, і мы будзем падтрымліваць гэты стандарт. У нас ёсць інтарэсы. Інтарэсы, якія не супярэчаць ні ў якім выпадку ні Польшчы, ні Прыбалтыцы, ні Украіне, ні Расіі, нашым суседзям, але гэта нашы інтарэсы. Калі вы гатовы па гэтых правілах працаваць — прыходзьце. Мы ні ад каго гэта не ўтойваем».

У прыклад Прэзідэнт прывёў куплю расійскім бокам «Белтрансгазу»: «Я адразу і вашаму Прэзідэнту, і прэм'еру сказаў: майце на ўвазе, у нас кадравая палітыка такая, што вы на гэты аб'ект самі не назначыце кіраўніка. Умову паставілі: ён павінен захоўваць інтарэсы як Расіі, так і Беларусі, калі ён тут працуе».

«Так, нас за гэта, яшчэ раз падкрэсліваю, часам крытыкуюць, але мы да гэтага спакойна ставімся. Захаваць гэты астравок цішы і спакойным — каштуе нямала. І павінен быць парадак і дысцыпліна, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Прычым не тая бязглуздзіца, што на вуліцы некага схапілі, пасадзілі і гэтак далей. Пасадзяць толькі таго, хто падаткі не плаціць, абкрадае дзяржаву. Любы прыватнік павінен гэта разумець — спуску тут нікому няма». Другое правіла — не крыўдзіць грамадзяніна любой краіны, які знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Плаці падаткі і не чапай іншых людзей. І ніхто табе перашкаджаць працаваць не будзе. І абмежаванняў у цябе практычна няма ніякіх, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. — Для таго, каб весці бізнес, у нас трэба заяву напісаць, пакласці на стол і ісці. У нас заяўны прынцып рэгістрацыі бізнесу. Але вельмі жорсткія ўмовы паводзін, менавіта паводзін самога бізнесмена. Каб не было, ведаеце, гэтых алігархічных замашак. Таму што людзі гэтага цярпець не будуць».

У цэлым, разважаючы на тэму карупцыі, кіраўнік дзяржавы выказаў меркаванне, што гэту негатыўную з'яву наўрад ці можна выкараніць поўнасцю, аднак неабходна трымаць яе на прымальным узроўні. «Такое ў нас жыццё цяпер, мы павінны гэта кантраляваць, і ўсе грамадзяне той ці іншай краіны павінны разумець, што ёсць парадак. Хоць не без хібаў, хапае іх і ў нас», — лічыць ён.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, «калі ўлада з галавы пачала падгніваць і там нядобрыя працэсы, ты нічога ў краіне не зробіш, каб не было карупцыі». «Я не хачу сказаць, што ў нас улада белая і пушыстая. Але няма ў нас сярод чыноўнікаў, каб дзесьці, ведаеце, казырнуць — палац, — адзначыў беларускі лідар. — Гэтыя дзеткі ў вас у Маскве на «Гелендвагене»... У нас адзін раз праехаў бы вось такім чынам, і больш тысячам не захацелася б ездзіць. А вы з імі там важдаецеся — то туды, то сюды, ён (ці яна) зноў садзіцца ў гэты аўтамабіль і стварае праблемы, а яшчэ раздушыць дзясятак чалавек. Адкупіцца, пасадзяць, заўтра выпусцяць і гэтак далей. А павінна быць сумленна і справядліва. Ёсць парадак у краіне, і яго трэба прытрымлівацца, і закон павінен быць для ўсіх аднолькавы».

«У нас на кіраўніковай праваахоўных органаў, пракурораў часта наскокі, што бізнесу не даюць развівацца — таго схапілі, гэтага схапілі. Па-першае, ніхто нікога не хапае. Я па сваёй першай адукацыі гісторык і ўмею рабіць высновы з гісторыі нашай краіны, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але ёсць правілы. Хапаюць і саджаюць толькі тых, хто гуляе недастойна ў гульні з дзяржавай, не плаціць падаткі. Падаткі — гэта святое. У Амерыцы самае жорсткае пакаранне за гэта — да 15 гадоў турмы, калі ты не плаціш нейкі дробны падатак. А ў нас гэта норма. Чаму так павінна быць?»

«Мы ўжо што толькі ні робім вакол гэтых бізнесменаў, на руках іх носім — ну дык вы ж плаціце падаткі за гэта», — дадаў Прэзідэнт.

## Аб прынцыпе справядлівасці

Аляксандр Лукашэнка лічыць галоўным пры прыняцці тых ці іншых дзяржаўных рашэнняў прынцып справядлівасці, падкрэсліваючы недапушчальнасць крыўдзіць людзей. «Вось некаторыя кажуць: беларусы — патрыёты. Пытаюцца: як вы патрыятызм выхоўваеце? Ды ніяк не выхоўваем. Патрыётам заўсёды будзе чалавек у той краіне, дзе ён будзе лічыць, што гэта яго зямля, і ён будзе шчаслівы, што яго дзеці будуць жыць на гэтай зямлі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«А для гэтага трэба стварыць справядлівае грамадства, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Я не скажу, што мы яго ўжо стварылі. Але мы да гэтага імкнёмся. Галоўнае — гэта справядлівасць. Нельга крыўдзіць людзей. Калі чалавек будзе пакрыўджаны на ўладу і на парадкі ў краіне, ён ніколі не будзе патрыётам. Што яму абараняць, што ён губляе, калі раптам штосьці здарылася? Вось аснова гэтага патрыятызму. Усё ў простым».

«Нам (у Беларусі і Расіі. — **Заўвага БЕЛТА**) трэба цяпер паглядзець на вельмі важныя пытанні, якія патрэбны для нармальнага жыцця чалавека, тады ён будзе патрыётам, і ніякія каляровыя рэвалюцыі нас не перавернуць. Але калі мы не будзем гэтым займацца, нас без каляровых рэвалюцый народ скіне пры той шалёнай дэмакратыі, якая сёння ў свеце», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

## Аб агульнай спадчыне і касмічным караблі

Захаванне памяці аб Вялікай Айчыннай вайне — гэта святое, адзначыў Прэзідэнт, заўважыўшы, што нават расіянам варта павучыцца ў беларусаў стаўленню да памяці аб Вялікай Айчыннай вайне. У Беларусі няма недагледжаных помнікаў, нават калі гэта створаныя па ініцыятыве вяскоўцаў «саматужныя» аб'екты. «Гэта памяць. Як мы ставімся, так і да нас будуць ставіцца потым нашы дзеці і нашы ўнукі. Таму гэта святое, у нас няма дыскусій у грамадстве па гэтым пытанні. Мы ніколі не ставілі яго пад сумненне», — сказаў Прэзідэнт.

Гаворачы пра свята 7 лістапада, Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што адмяняць яго дачасна. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, няма таго, што неабходна з гісторыі выкінуць. «Нельга вырываць з гісторыі тое, што здаецца нам цяпер з пункту гледжання палітыкі выгадным, а астатняе замоўчваць. Будзем пажынаць дрэнныя плады, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба ўсё паказваць і тлумачыць, як яно было, наколькі гэта сёння магчыма».

Створаную пакаленнямі гісторыю трэба перадаць дзецям і ўнукам у тым выглядзе, якая яна ёсць, не перапісваючы. Гісторыя не ідэальная — ідэальнага нічога няма. Проста трэба спрабаваць каб убачыць яе аб'ектыўнай, адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы аб інфармацыі ў СМІ аб тым, што нібыта ў рэспубліцы ідзе працэс «мяккай беларусізацыі», мае месца ўціск рускамоўнага насельніцтва, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «У нас палавіна ўрада рускіх, а то і больш. Няма ў нас такіх праблем. Мы гэтым ганарымся, гэта наш імідж».

«У рускай мове — душа беларускага чалавека. Колькі мы разам жылі, размаўлялі на гэтай мове і ўкладвалі не толькі душу, але і свае каштоўнасці. Гэта наша агульная мова, наш найвялікшы здабытак», — адзначыў кіраўнік дзяржавы, падкрэсліўшы, што ад такой спадчыны нельга адмаўляцца.

Была закранута і тэма космасу: акурат учора на арбіту ў складзе расійскага экіпажа адправіўся беларус Алег Навіцкі. А вось пра ўласна беларускі касмічны карабель размова пакуль не ідзе, расказаў Прэзідэнт: «Гэта ж не проста для іміджу, праект павінен быць у нейкай ступені акупны. Думаю, гэта не было б праблемай — пабудаваць карабель разам з расіянамі, або еўрапейцамі, або амерыканцамі. Пытанне толькі — ці трэба. Паколькі ўласныя задачы мы можам вырашыць і разам з расіянамі, закінуўшы ў космас касманаўта са сваёй праграмай. Хутчэй за ўсё, і танней гэта будзе зрабіць такім чынам», — сказаў Прэзідэнт.

Беларусь мае спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, ёсць і спадарожнік сувязі на арбіце. Больш таго, беларусы стварылі свой ЦКП разам з кітайскімі спецыялістамі, а таксама прайшлі навучанне, яны вельмі падрыхтаваны для работы ў комплексе кіравання. Хутка Беларусь запусціць наступны спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, гэта ўласны прадукт на аснове расійскай платформы.

## Пра інтэрнэт і СМІ

«Мы — самая свабодная краіна ў плане інтэрнэту, і, калі ў нас спрабавалі праз інтэрнэт здзейсніць каляровыя рэвалюцыі, мне многія гаварылі, што яго трэба закрыць. Але я сказаў, што трэба на гэтых сайтах, гэтых старонках змагацца з імі іх жа метадамі. І мы не закрылі, не абмежавалі нікога, а ў сацсетках працавалі як належыць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Інтэрнэт — гэта вельмі добра, але ён з вялікімі недахопамі. Павуціна вялікую прыносіць карысць у плане стасункаў і гэтак далей, але і вельмі вялікія ёсць адмоўныя моманты», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

У якасці прыкладу негатыўнага ўплыву інтэрнэту Прэзідэнт прывёў арганізацыю ўзрыву ў мінскім метро некалькі гадоў таму. «Быў адзіны тэракт, калі наш беларус, з Віцебска родам, з інтэрнэту ўсё атрымаў, стварыў выбуховае ўстройства, у метро аднёс і ўзарваў для таго, каб, ведаеце, палюбавацца або паказаць сябе. Але мы пасля гэтага ўсё роўна інтэрнэт не закрылі. Працаваць трэба. Значыць, недзе мы не дапрацоўваем», — сказаў беларускі лідар.

Ён таксама прызнаўся, што сам вельмі акуратна ставіцца да інтэрнэту, таму што для яго кніга, друкаванае слова — гэта святое. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у яго няма старонак у сацыяльных сетках і ён не з'яўляецца інтэрнэт-залежным чалавекам. Акрамя таго, ён кантралюе, колькі часу ў сетцы праводзіць яго малодшы сын.

Што датычыцца сродкаў масавай інфармацыі, у Беларусі няма ніякага залішняга ціску на іх, адзначыў Прэзідэнт. У краіне захаваны ўсе вядучыя газеты — не толькі рэспубліканскія, але і абласныя, раённыя. «Гэтыя выданні атрымліваюць дапамогу ад органаў улады. Гавораць, што калі дзяржава фінансуе з бюджэту — значыць, выданне залежнае. Але ніхто з вядучых сродкаў масавай інфармацыі не скажа, што залішне нехта над імі стаіць. Так, мы просім журналістаў, каб у сваіх матэрыялах яны былі аб'ектыўныя, але і крыху нахілены ў бок дзяржавы, каб захаваць мір, спакой, стабільнасць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Я іх (СМІ. — **Заўвага БЕЛТА**) крытыкую, чаму мала крытыкі. Людзі бачаць, калі мы трубім у адзін бок, і чытаць не будуць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён лічыць, што трэба паказваць і станоўчыя прыклады, і недахопы — павінна быць збалансаванасць.

***(Заканчэнне на 4-й стар.)***

# У ФАРМАЦЕ ШЧЫРАГА ДЫЯЛОГУ

## Пра гатэлі і айчынныя аўтамабілі

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што гасцініц не хапае хутчэй у рэгіёнах, а не ў сталіцы. «Павольна мы рухаемся і ў плане будаўніцтва гасцініц. Але не скажу, што ў нас інвестыцыйны бум у гэтым плане... Будавацъ будзем, але толькі ў тых рэгіёнах, дзе адчуваем акупнасць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На акупнасць у першую чаргу звяртаюць увагу і патэнцыяльныя інвестары. Напрыклад, учора ў Астраўцы адкрылася гасцініца, пабудаваная турэцкім інвестарам. Блізкасць да будуемай атамнай станцыі і высокія тэмпы развіцця раёна дадуць магчымасць акупіць гэты праект даволі хутка, канстатаваў Прэзідэнт.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, у Мінску спецыяльна да Еўрапейскіх гульняў — 2019 гасцініцы будавацца не будуць. «Перажывём гэты бум — задзейнічаем студэнцкія інтэрнаты, як гэта было на чэмпіянаце свету па хакеі. Пабудуем гасцініцы, а што потым? Іх жа трэба запоўніць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Пакуль у сталіцы ёсць некаторыя цяжкасці з запоўненасцю гасцініц, дадаў Прэзідэнт.

А вытворчасць аўтамабіляў на будуемым заводзе «БелДжы» плануецца запусціць у першым квартале 2017 года. «Нядаўна я зацвердзіў праграму — ніводнай імпартнай машыны, толькі айчынныя ў дзяржаўных структурах. У нас ёсць уласная вытворчасць легкавых аўтамабіляў, мы яе стварылі разам з кітайцамі, а цяпер завяршаем будаўніцтва завода па вытворчасці спачатку 60 тысяч аўтамабіляў у год. Дарэчы, гэтыя аўтамабілі прадаюцца ў Расіі. Мы не шмат іх цяпер вырабляем, тры мадэлі, я іх усе апрабаваў асабіста. Адзін з гэтых аўтамабіляў мы з вялікім задавальненнем будзем эксплуатаваць у дзяржорганах, суб'ектах гаспадарання», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

## Пра канфлікт ва Украіне і яго ўрэгуляванне

«Я сказаў нядаўна Уладзіміру Уладзіміравічу (Пуціну. — **Заўвага БЕЛТА**), што, чаго б ні каштавала, трэба цяпер штосьці прыдумаць такое, каб пачаўся адваротны працэс, аднаўленне адносін. Пераможцаў у гэтай бойні не будзе, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба сёння выходзіць з гэтай сітуацыі. Мы гатовы любую ролю адыграць толькі дзеля таго, каб там быў мір». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што, чым даўжэй будзе працягвацца канфлікт, тым горш будзе і для Украіны, і для Расіі. «Я ўжо не гавару аб тых, хто там (у зоне канфлікту. — **Заўвага БЕЛТА**) застаўся. У чым вінаватыя людзі, якія там жывуць? — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт. — Так, страшна, калі чакаеш, што зверху штосьці ўпадзе і разарвецца. Але яшчэ горш нявызначанасць. Яны не ведаюць, што будзе заўтра, паслязаўтра, як ім быць».

«Калі два бакі дамовяцца і ўбачаць ролю Беларусі, мы гатовы любую ролю адыграць толькі дзеля таго, каб там быў мір. Калі вы хочаце, каб мы правялі масцовыя выбары (прытым сумленна, абсалютна сумленна), пра якія столькі гавораць, — мы гатовы гэта арганізаваць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі вы хочаце навесці парадак на 400 км граніцы паміж Украінай і Расіяй, калі ласка, мы гэта зробім. Калі вы гэтага хочаце — самі мы не палезем туды». Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз звярнуў увагу: «Мы гатовы працаваць толькі для таго, каб гэта сітуацыя ўстаканілася і ўціхамірылася. Там патрэбны мір. Мы свае прапановы і Захаду ўнеслі: яны ў нас пыталіся. Уладзімір Уладзіміравіч (Пуцін. — **Заўвага БЕЛТА**) ведае нашы прапановы. Маўчаць. Значыць, ім не хочацца, каб у гэтым рэчышчы развіваліся падзеі. Асабліва Захад. Мы ім яшчэ ў пачатку канфлікту гэтыя прапановы ўнеслі — цішыня. Значыць, ім не патрэбны мір ва Украіне. Мы гатовы ўключацца і вырашаць задачу ва Украіне, нават калі з першага погляду яна нам не патрэбна і не выгадна. Потым усё роўна гэта і нас закране». Пры гэтым кіраўнік дзяржавы асабліва падкрэсліў: «Мы не рвёмся ў нейкія міратворцы або пасрэднікі. Я гэтага цярпець не магу. Я не цярплю пасрэдніцтва, а па-чалавечы, па-мужчынску, па-братэрску мы гатовы падключыцца там, дзе трэба».

## Пра спорт і не толькі

Не абышлі ўвагай журналісты і каляспартыўныя скандалы, што адбываліся падчас Гульняў у Рыа. Каментуючы вынас і дэманстрацыю расійскага сцяга беларускім спартыўным чыноўнікам Андрэем Фомачкіным на Параалімпіядзе ў знак салідарнасці са зборнай Расіі, якую да ўдзелу не дапусцілі, Прэзідэнт адзначыў, што гэта была «дэманстрацыя нашага адзінства». «Мы гэтым хацелі паказаць, што абсалютна салідарныя з расіянамі ў плане незаконнага і несправядлівага націску з боку пэўных сіл на Расійскую Федэрацыю», — прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка.

У Беларусі, дадаў Прэзідэнт, бачылі несправядлівасць у адносінах да параалімпійскай зборнай Расіі і не маглі спакойна паставіцца да гэтай сітуацыі. «Мы зрабілі, як і павінен быў у гэтай сітуацыі зрабіць любы блізкі чалавек, калі крыўдзяць яго брата», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што націск у плане допінгу аказваецца не толькі на Расію, але і на Беларусь, Казахстан. «Прэтэнзій да нас дастаткова, але яшчэ больш іх да нашых сапернікаў, якія бы цам бы чыстыя», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, нагадаўшы аб уцечках даных Сусветнага допінгавага агенцтва.

«Спартсменам трэба быць сапраўднымі спартсменамі. Мы можам перамагаць без усялякіх допінгавых, фармацэўтычных прэпаратаў, але трэба, каб мы знаходзіліся ў роўных умовах», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі для спорту зроблена вельмі шмат. «Скажу сумленна, спартсмены нам пакуль не адказалі на гэта сваёй працай і сваімі дасягненнямі, за што я іх і крытыкую. У найбліжэйшы час разбор палётаў будзе вельмі сур'ёзны пасля Алімпіяды», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Няма сапраўднага падыходу і патрабавання да спартсменаў. Грошы патрабуюць вялікія, а рэзультату няма. Мы такіх начаі прымушаць працаваць і за работу плаціць. Няма работы — няма грошай», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## Пра асабістае

Падчас прэс-канферэнцыі Прэзідэнт неаднойчы з вялікай гордасцю гаварыў пра Беларусь, мір і згоду, якія пануюць у нашай краіне.

«Што такое Беларусь для тых, хто тут не бываў, якія выклікае асацыяцыі? Дранікі, Белавежская пушча, добрыя дарогі, зубры, гіганцкія самазвалы, шматфункцыянальныя трактары, якасныя прадукты... Але на самай справе Беларусь значна больш цікавая і багатая»... «У нас няма гэтай праблемы (міжканфесійных і міжнацыянальных канфліктаў. — **Рэд.**) Нават не магу сказаць, што мы робім для таго, каб так было. Мы проста жывём. Жывём як адзіны народ. Што датычыцца рэлігіі, лозунг адзін — кожны знойдзе сваю дарогу да свайго храма...» А калі кіраўніка дзяржавы запыталі пра яго малую радзіму, ён шчыра адказаў: «Па-сапраўднаму супакоіца, правесці некалькі гадзін я магу толькі ў Александрыі, дзе мы з маці жылі...»

Задавалі Прэзідэнту і іншыя асабістыя пытанні. Пра любімы лік (трынаццаць), пра шанцаванне («Проста так каб пашанцавала, з неба ўпала — я не магу прыпомніць, але вельмі разлічваю на шанцаванне, як і любы чалавек»), пра гаспадарку і жывёл на падворку («У мяне вельмі шмат жывёл. Страусы, індакачкі, качкі, 25 гусянят (да Нова года дару людзям), куры кітайскія, куры звычайныя, трусы (засталося 20 — выключна для таго, каб падарыць камусьці), 10 кароў, 10 коз, 15 авечак, 7 ці 8 коней, чатыры сабакі (дзве лайкі, лабрадор і нямецкая аўчарка — усе падораныя), тры каты»), пра тое, як ён адпачывае (змена віду дзейнасці — найлепшы адпачынак)...

Размова сапраўды атрымалася шчырая, сур'ёзная і цікавая. «Адчуваецца, што Аляксандр Лукашэнка вельмі любіць сваю краіну, беларускі народ і многае робіць для яго дабрабыту», — дзяліліся ўражаннямі расійскія калегі.

**Паводле БЕЛТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1—3-й стар.)*

## Каментарый у тэму

# Новыя тэхналогіі ідуць за эканомікай

**Супрацоўніцтва ў ЕАЭС і інавацыйныя тэхналогіі, алімпійскія рэкорды і адносіны да Радзімы — Аляксандр Лукашэнка закрануў вельмі шырокае кола тэм, адказваючы на пытанні расійскіх журналістаў. Мы звярнуліся да прадстаўнікоў Магілёўскай вобласці ў беларускім парламенце, каб яны пракаментавалі, як сучасныя тэндэнцыі цяпер адбіваюцца на жыцці грамадзян.**

**Ірына ПЯТРОВА, член Савета Рэспублікі (абрана ад Магілёўскай вобласці), галоўны ўрач Глускай цэнтральнай раённай бальніцы:**

— Прэзідэнт падчас прэс-канферэнцыі адзначыў, што будучыня — за найноўшымі тэхналогіямі. Гэта тычыцца ўсіх сфер, у тым ліку і аховы здароўя. Калі казаць пра наш раён, то для атрымання высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі мы накіроўваем пацыентаў на абласны і рэспубліканскі ўзроўні. Асноўныя кірункі дзейнасці нашай бальніцы — гэта першасная, спецыялізаваная і паліятыўная дапамога. Вядома, мы ўкараняем сучасныя методыкі лячэння і дыягностыкі. Наколькі хутка новыя тэхналогіі будуць пранікаць на ўзровень раёна, залежыць, перш за ўсё, ад эканамічнага стану. Калі будуць развівацца прамысловасць, сельская гаспадарка, малое і сярэдняе прадпрымальніцтва, колькасць насельніцтва ў раёне вырасце, тады можна чакаць і выхаду на новы тэхналагічны ўзровень.

Тое, што ў нашай краіне аказанне медыцынскай дапамогі даступна кожнаму незалежна ад узроўню даходаў, мае вялікае значэнне. Асабліва гэта актуальна для жыхароў нашага раёна. Калі пацыенты не могуць наведаць паліклініку, тады яны звяртаюцца ў ФАПы і амбулаторыі, туды прыязджаюць дактары, лабаранты. Фельдшары даходзяць да кожнага пацыента, калі неабходна — разносяць лекі. Мы, як і любая раённая бальніца, працуем фактычна з кожным чалавекам.

**Таццяна КАНАНЧУК, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— Магілёўская вобласць супрацоўнічае з некалькімі рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі. Мы развіваем прыгранічнае супрацоўніцтва. У гэтай сферы ў нас ужо напрацаваны вопыт, заключаны шэраг кантрактаў з рэгіёнамі. Нашы партнёры знаходзяцца ў Бранскай і Смаленскай абласцях. Развіццё ідзе па некалькіх галінах, таму сувязі напрацаваныя добрыя. Важна, што мы працягваем заключаць кантракты і развіваць наша супрацоўніцтва. Партнёрства паміж бізнесамі Беларусі і Расіі напрамую адлюстроўваецца на паляпшэнні якасці жыцця грамадзян. Рост бізнесу — гэта павелічэнне і паляпшэнне прадукцыі і новыя рабочыя месцы. Вельмі адказны момант — ва ўзаемадзеянні з Бранскай вобласцю значную ролю іграе праца з моладдзю. Гэта фарміруе ініцыятыўныя кадры для сённяшніх і, што важна, будучых міждзяржаўных адносін.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*
**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## Меркаванні

# Чаму расіяне нам па-добраму зайздросцяць?

**Напачатку прэс-канферэнцыі кіраўнік нашай дзяржавы прапанаваў фармат дыялогу. У выніку атрымалася цалкам адкрытая, даверлівая размова. Прадстаўнікі самых розных сродкаў масавай інфармацыі задавалі пытанні, выказвалі ўласныя думкі пра Беларусь, пра беларуска-расійскія адносіны, пра супрацоўніцтва рэгіёнаў. Цікава, што многія расійскія журналісты ў Беларусі — упершыню. Карэспандэнт «Звязды» пацікавілася ў калег пра іх уражанні ад нашай краіны, пра тое, якім яны бачаць далейшае беларуска-расійскае супрацоўніцтва.**

**Таццяна ЕЎДАКІМАВА, газета «Чехов сегодня» (Маскоўская вобласць):**

— Беларусь не «савок». Хіба што ў самым добрым сэнсе! Нават у часы сацыялізму ў Расіі такога не было!

Уразіла беларуская сістэма аховы здароўя. Менавіта сістэма дзяржаўнага забеспячэння, аказання медыцынскай дапамогі, асабліва дзецям, — цалкам асаблівая. Тут якраз і захавалася тое лепшае, што было ў СССР. Акрамя таго, з'явілася шмат новага. У Расіі таксама ўсё гэта ёсць, але ў нас медыцынскія паслугі каштуюць столькі, што сярэднестатыстычнаму жыхару не па кішэні. А страхавая медыцына пакрывае далёка не ўсе аспекты. Магу сказаць, што праз сваё выданне я буду шукаць спонсараў, каб лячыць расійскіх дзетак у беларускіх медыцынскіх цэнтрах.

Яшчэ адзін «пазітыўны шок» — гэта беларуская сельская гаспадарка. У СМІ я працую вельмі даўно. Я шмат разоў была на савецкіх фермах, ведаю, што такое сельская гаспадарка. Нядрэнны ўзровень там захоўваўся і ў савецкай Расіі, але цяпер, на жаль, не засталося амаль нічога — прынамсі, у Падмаскоўі. Беларуская ж вёска мне вельмі спадабалася. Я паглядзела, як у вас усё робіць. Малочная вытворчасць вышэй за ўсялякія пахвалы — пачынаючы ад стэрыльнасці і заканчваючы натуральнасцю. Я вам, беларусам, па-добраму зайздрошчу. Вы жывяце ў добрай краіне.

**Венера ЯКУПАВА, галоўны рэдактар газеты «Казанские ведомости»:**

— У мяне цудоўныя ўражанні ад гутаркі з Прэзідэнтам Беларусі, ад усёй прэс-канферэнцыі, ад краіны. Аляксандр Рыгоравіч — чалавек, які з вялікай павагай ставіцца да журналістаў, вельмі любіць сваю Радзіму. Адказвае ён не павярхоўна, глыбока ведае самыя розныя пытанні. Паколькі я сама прадстаўніца газеты, мне было прыемна пачуць, што для Аляксандра Рыгоравіча газета, кніга — увогуле, друкаванае слова — гэта святое.

У падарунак Прэзідэнту Беларусі я прывезла сваю новую кнігу, якая называецца «Путеводитель до Берлина». У ёй выкладзены гісторыі чытачоў газеты «Казанские ведомости» пра тое, якія франтавыя, ваенныя рэліквіі яны захоўваюць дома ў памяць пра сваіх родных. Сярод гэтых гісторый ёсць і гісторыя майго дзядзькі. Зусім нядаўна высветлілася, што ён загінуў у 18 гадоў, вызваляючы ў 1944 годзе Беларусь. Ён пахаваны ў Віцебскай вобласці ў вёсцы Пясчаная. Звалі яго Анвар Якупаў... Я вельмі хачу, каб ваш Прэзідэнт пазнаёміўся з гэтай кнігай, і мне вельмі прыемна, што яна будзе знаходзіцца ў Прэзідэнцкай бібліятэцы.

**Андрэй АНТОНАЎ, газета «Новый Петербург»:**

— Для сябе я ўсвядоміў тое, што Беларусь працягвае крочыць наперад. Уводзяцца ў эксплуатацыю новыя аб'екты грамадзянскай інфраструктуры. Мы бачылі лядовы спартыўны палац, былі ў школе ў Магілёве, у гарадской клінічнай дзіцячай бальніцы. Я ўжо не ўпершыню ўдзельнічаю ў падобных прэс-турах. Заўважыў, што калі раней большая ўвага надавалася эканоміцы, развіццю сельскай гаспадаркі, то зараз на аснове ўжо закладзенага эканамічнага фундамента ствараюцца тыя аб'екты сацыяльнай інфраструктуры, якія забяспечваюць нармальнае, больш паўнацэннае жыццё краіны. Гэта добра. Тыя ж самыя спартыўныя збудаванні, Палацы культуры, дзе займаецца шмат дзяцей... Тое, што дзяржава ўкладвае ў моладзь, дапаможа ў будучыні.

Увогуле супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі — стратэгічная задача і для Расіі, і для Беларусі. Яно павінна ўмацоўвацца. Павінна ўмацоўвацца і развівацца наша Саюзная дзяржава, пераходзіць у больш моцныя, паўнацэнныя дзяржаўныя формы. Патрэбны больш эфектыўныя органы кіравання, якія, магчыма, у большай ступені аказвалі б станоўчы ўплыў як на жыццё ў Расіі, так і на жыццё ў Беларусі.

**Аляксандр ЯГОРАЎ, газета «Советская Чувашия» (Чабаксары):**

— Хацелася б пераняць беларускую шчырасць, любоў да сваёй зямлі, павагу да сваіх людзей. Беларусь — небагатая краіна, якая, тым не менш, умее выкарыстоўваць усе рэсурсы для таго, каб выжыць у гэтым няпростым свеце. Гэта вельмі вялікі плюс, які ўсяляе павагу.

**Павел СІДАРУК, журналіст, старшыня Савета Грамадскага руху «Сябры» (Кабардзіна-Балкарыя):**

— Мне даўно хацелася ўбачыць Магілёўшчыну, бо, хоць і сам беларус, там пабываць не даводзілася. Склаліся вельмі добрыя ўражанні, асабліва ў тым, што тычыцца сельскай гаспадаркі, прамысловага комплексу. Мы пабывалі на «Белшыне», на «Магілеўліфтмашы». У цэлым жа ў Беларусі мне імпануе дысцыпліна, парадак, прадуманасць усіх рашэнняў і дзеянняў.

**Соф'я ПЕШНЯ, інфармацыйнае агенцтва «Иркутск-Медиа»:**

— Мне здаецца, што я ў Беларусі ўжо месяц знаходжуся! У нас была вельмі насычаная праграма. Наведалі шмат цікавых вытворчых прадпрыемстваў. Я ўпершыню ў прэс-туры, упершыню ў Беларусі — і мне ўсё падабаецца. У вас столькі прадпрыемстваў, якія, здаецца, забяспечваюць усю Беларусь. Дагэтуль я ніколі не бывала на заводах, і ад наведвання беларускіх — пад уражаннем. На маю думку, у вашай краіне вельмі развітая эканоміка.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# «Бярыце наша народжанае, а прывязіце — хрышчонае»

## У старажытным абрадзе закладалася формула ўсяго жыцця чалавека

**Ёсць у нас сямейны анекдот. Калі кумы ехалі ў касцёл хрысціць маю цётку, па дарозе забыліся, якое імя хацелі даць дзяўчынцы бацькі. Вяртацца не было магчымасці, таму, доўга не думаючы, вырашылі назваць так, як і будучую хросную, — Леангінай. Цётка заўсёды крыўдавала, калі бабуля са смехам расказвала гісторыю яе незвычайнага імені. Але паводле беларускіх традыцый кумы прынялі правільнае рашэнне, бо ў даўнія часы імя дзіцяці давалі менавіта хросныя, а ўжо вярнуўшыся з храма, паведамлялі яго бацькам і гасцям сямейнага свята.**

**Гледачы тэлеканала «Беларусь 3» на працягу ўсяго лістапада маюць магчымасць больш даведацца пра тое, як ладзілі хрышчэнне нашы продкі, паслухаць песні, што выконваліся падчас гэтага абраду ў розных рэгіёнах краіны. Выпускі праграмы «Наперад у мінулае» з экспедыцый на Жыткавіччыну і Ашмяншчыну ўжо выходзілі ў эфір. А ў нядзелю, 20 лістапада, аматары беларускай песні ўбачаць, як спрадвек праводзілі свята ў вёсцы Азіна, што на Полаччыне. Традыцыйна разам з камандай праекта вандруе і карэспандэнт «Звязды».**



Важны элемент хрэсьбінаў — спевы-вітанні бацькам.

### Каб дзіця расло здаровым і шчаслівым

Нашы продкі лічылі: падчас хрышчэння задаецца формула жыцця чалавека, вызначаецца яго лёс. Таму не дзіўна, што гэты абрад суправаджаецца мноствам прыкмет, рытуалаў і забабонаў. Да хрышчэння нават імя немаўляці не давалі, каб абараніць яго ад уздзеяння злых сіл. Так, у вёсцы Буразь на Жыткавіччыне першыя тры месяцы немаўля закручвалі ў ношаныя кашулі, а спаць клалі ў ночвы, пакрытыя полагам, — каб ніхто не сурочыў. Хлеб, які кум дарыў бацькам падчас абраду хрэсьбін, павінны былі адкусіць усе госці — каб дзіця хутка загаварыла. Таксама тут прынята пры першым знаёмстве з малым класці яму грошы пад падушку — на дзіця нельга глядзець «голым» вокам.

Яшчэ больш правілаў павінна было выконвацца гасцямі і хроснымі на Ашмяншчыне. У вёсцы Паляны з даўніх часоў існуе традыцыя: апроч кумоў, запрашаць хросную бабку-павітуху — кабету сталага ўзросту. Быць хроснай бабкай — вялікі гонар. Тут кажуць, што тая жанчына, якая ніколі не выконвала гэтую пачэсную ролю на хрэсьбінах, на тым свеце будзе зайцоў пасвіць. Павітуха павінна згатаваць «бабіну» кашу і разам з іншымі падарункамі для хрэсніка прынесці яе на свята. Перад хрышчэннем немаўля купалі, а калі збіралі дзіця ў храм, каля правага боку клалі хлеб — каб чалавек заўсёды быў сытым, а каля левага — соль, каб не баяўся сурокаў. Пасля абраду хрышчэння немаўля тры дні не мылі і не здымалі тую кашулю, у якой яно стаяла «пад Хрыстом». У гэтай жа кашулі трэба было хрысціць і наступных дзяцей, якія нараджаліся ў сям'і, — каб яны жылі ў ладзе і згодзе.

Кума несла ў дом немаўляці хлеб, які сімвалізаваў дастатак у хаце. Выпраўляючыся ў храм разам з немаўлём, хросныя павінны былі пераступіць парог, на які клалі прылады працы — каб дзіця не было гультаём, у будучыні стала добрым майстрам. Па дарозе ў царкву кумам забаранялася спыняцца, злазіць з воза, збочваць, саступаючы дарогу іншым, а таксама размаўляць — каб дзіця не было крыклівае.

Калі хросная бабка сустракала кумоў з царквы ў хаце, яна апранала кажух, вывернуты калматым бокам наверх, — дзеля здароўя і багацця дзіцяці, а пад парог клалі аўчыну — дзеля дабрабыту кумоў. Вяртаючы бацькам дзіця, кумы паведамлялі, якое імя атрымаў хлопчык ці дзяўчынка, а таксама казалі: «Ваша народжанае, а наша — хрышчонае. Хай стаіць пад вянцом, як сёння — пад Хрыстом». Уже ахрышчанае немаўля клалі на стол, каб дзіця спала спакойна, цягалі яго за ножкі — каб было высокае і прыгожае. За святочным сталом кумам дазвалялася выпіць толькі цотную колькасць чарак. Лічылася, што гэта будзе спрыяць таму, каб хлопчык ці дзяўчынка заўсёды былі ў пары. Падчас бяседы нельга маўчаць, госці павінны жартаваць, весяліцца і спяваць — каб дзіця хутка загаварыла і прыязна ставілася да людзей. Таму і песні, што спяваюць у гэтай мясцовасці падчас хрэсьбін, у асноўным жартоўна-здзеклівыя. Натуральна, жартавалі з кумоў і хроснай бабкі. У вёсцы Паляны на Ашмяншчыне ведаюць, напрыклад, такую песню:

*А ў садзе явар зелянюсенькі,*
*На куце кумок маладзюсенькі.*
*А ў садзе вішня зелянюсенька,*
*На куце кума маладзюсенька.*
*Пад гарой вярба сукаватая,*
*На куце бабка гарбатая.*

Госці павінны працягнуць жарт і дадаць гучна: «Але багатая», тады і пачыналі дарыць малому падарункі.



Пад спевы гасцей, смех і плясканне ў ладкі ў Азіне прынята катаць бабулю ў ночвах.

### Кіруемся ў Азіна

Гэтая маляўнічая вёска на Полаччыне месціцца на беразе прыгожага возера Белае. Легенда распавядае, што ў далёкія часы на яго берагах пасяліліся племя людзей, якія пакланяліся Перуну. Аднойчы гэтаму богу не спадабалася ахвярапрынашэнне, і ён наслаў на зямлю магутны вецер. Ён разбураў жытло, ламаў дрэвы. Калі бура сціхла, уся зямля і возера былі ўсыпаны белымі кветкамі яблынь. З той пары і вёску, і возера сталі называць Белае. Згадкі пра мястэчка Белае сустракаюцца ў дакументах з часоў вайны 1654—1669 гадоў. Спачатку яно складалася з мураванага касцёла і царквы пры дарозе з Полацка. У сярэдзіне XIX стагоддзя тут пабудавалі царкву. Сама вёска большала і большала. Значным для яе жыхароў стаў 1975 год, калі гістарычная назва была зменена.

Сёння ў назве вёскі ўшаноўваецца памяць Уладзіміра Азіна, удзельніка Грамадзянскай вайны. Хоць даследчыкі і лічаць яго латышом па нацыянальнасці, нарадзіўся Азін на Беларусі, у вёсцы Мар'янава колішняга Полацкага павета. У часы вайны ён быў вядомы як вельмі смелы, мужны і адважны салдат. Дывізію, якую ўзначальваў, нават называлі «жалезнай» — столькі перамог яна атрымала.

Але цяпер Азіна можна лічыць не толькі турыстычным цэнтрам, дзе на бегарах возера ўлетку адпачывае мноства вандроўнікаў, але і мясцінай, знакавай для нашай культуры. Тут па ўспамінах старажылаў узноўлены ўнікальны абрад хрышчэння, які пашанцавала пабачыць здымачнай камандзе праекта «Наперад у мінулае» і нашаму карэспандэнту. Для нас правёў абрад гурт «Бела чайка», што існуе пры Азінскім сельскім Доме культуры.

### «Мая кумка маладзее»

Так, выпраўляючы кумоў з немаўлём у храм, тут спрадвеку бацькі разам з хроснымі абыходзілі тры разы вакол стала — у тым напрамку, як рухаецца сонца. Каля дзіцяці клалі гліну і соль. Па дарозе на хрышчэнне, на скрыжаванні дарог, кумы абавязкова павінны іх выкінуць, каб немаўля ніхто не сурочыў. Перад дарогай, каб шлях быў добры, усе сядалі і хвіліну сядзелі моўчкі. Адметна, што насупраць дзвярэй сядзець не дазвалялася. Каля парога ў хаце клалі лён і іголку — каб дзяўчынка была добрай гаспадыняй. Кумы тройчы падымалі дзіця перад парогам і рушылі ў храм. Пры гэтым усе павінны былі выйсці з хаты — каб правесці дзіця на хрышчэнне.

**Выпіваючы першую чарку, госці казалі: «Бачылі пад Хрыстом, дай Божа ўбачыць пад вянцом». Тым самым прарочылі шчаслівае жыццё немаўляці, а сабе — доўгі век.**

Тут таксама выконвалі мноства правілаў. Каб дзіця загаварыла хутка і выразна — кумы павінны адразу назваць імя, якое далі немаўляці пры хрышчэнні. На здароўе, спакойны сон і як абарону ад злых сілаў у калыску, дзе будзе спаць ужо хрышчонае дзіця, клалі вугольчык, хлеб-соль і лыжачку.

Песня — важная частка абраду хрышчэння. Спачатку песняй віталі маці, а потым славілі бацьку. Дарэчы, для маці спявалі досыць сумную песню, а бацьку прысвячалі жартоўную і ў той жа час вельмі сімвалічную. Яна зашыфравана распавядае пра зачацце і нараджэнне дзіцяці:

*А спасіба кавалю,*
*Што скаваў нам дзіця.*
*Ну а кузня ў яго*
*Вельмі цёплая была.*
*А сама каваліха*
*Добры мех надула.*

**Хлеб, які кум дарыў бацькам падчас абраду хрэсьбінаў, павінны былі адкусіць усе госці — каб дзіця хутка загаварыла.**

Святочная бяседа распачыналася зазвычай адмысловым абрадам надзялення першай чаркай. Выпіваючы першую чарку, усе госці казалі: "Бачылі пад Хрыстом, дай Божа ўбачыць пад вянцом". Тым самым прарочылі шчаслівае жыццё немаўляці, а сабе — доўгі век. За сталом праводзілі яшчэ адзін абрад: кумам налівалі гарэлку, яны клалі ў чаркі манеты, крыху адпіўшы, астатняе вылівалі як мага вышэй угору са словамі: «Божа, блаславі, каб наш(а) хрэснік(ца) вось так высока скакаў(ла)».

Кумы, як і бабуля, за сталом лічыліся аднымі з галоўных асоб. Ім надавалася пільная ўвага. Так, кум і кума павінны сядзець блізка і не перакрыжоўваць ногі — каб іх хрышчонае дзіця мела роўныя зубы. З нагоды гэтай вымушанай застольнай «блізкасці» госці часта жартавалі і пыталіся ў кумоў, ці не паспелі яны закахацца адно ў аднаго. Натуральна, кумам прысвячаліся песні. Напрыклад, вось такая:

*Каб я знала, каб я ведала,*
*Што ты ў мяне кумой будзеш,*
*Пасадзіла б я цыбе*
*ў гародзе на траве*
*Чырвоную ружаю.*
*Дожджык ліе, сонца грэе,*
*Мая кумка маладзее.*

Асаблівым чынам аддавалі пашану і бабулі. Гэта, як традыцыйнае для гэтай мясцовасці катанне ў карыце, ці ночвах, гульня з выкраданнем бабуліных падарункаў кумам. Таксама гасцей запрашалі на «бабіну» кашу — ёй частавалі не проста так, а за грошы. Пры гэтым «продаж» ператвараўся ў цэлы спектакль з пажаданнямі дзіцяці, яго маме і тату. Усе сабраныя грошы потым аддавалі бацькам.

Адметна, што хрышчэнне дзіцяці станавілася святам не толькі для сям'і, а і для ўсёй вёскі. Так, катанне бабулі ў начоўках зазвычай адбывалася пад гучныя спевы, плясканне ў ладкі і грукат палкамі аб пустыя вёдры. Так аднавяскоўцы ведалі: у гэтай хаце вялікая радасць і свята. Святкаванне доўжылася да глыбокай ночы, гульні і песні былі амаль бясконцымі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Ёсць нагода

# ВЫДАТНІЦА ЭФІРУ

## Святлана БАРОЎСКАЯ адзначыла творчы юбілей

**17 лістапада папулярная тэлевядучая канала «Беларусь 1» Святлана Бароўская адзначыла не толькі чарговы дзень нараджэння, але і яшчэ адну знакавую для сябе дату — 25 год працы на беларускім тэлебачанні.**

Выпускніца Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута рэалізавала сябе ў кіно, зняўшыся ў 14 рознапланавых праектах (у тым ліку ў баевіку «Дээерцір» у тандэме з уласным мужам, акцёрам Анатолем Кацянёвым), іграла ў тэатры, кіравала прэс-службай МУС, але сапраўдную вядомасць ёй прынесла менавіта тэлебачанне. За высокі прафесіяналізм і творчыя дасягненні тэлевядучая, нагадаем, сёлета была адзначана высокай дзяржаўнай узнагародай — медалём Францыска Скарыны.

Напэўна, даўжэй за ўсё — 19 гадоў! — Святлана працуе ў камандзе ранішняга «тэлевізійнага будзільніка», праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!». Не дзіва, што адзін з галоўных сюрпрызаў да творчага юбілею вядучай падрыхтавалі менавіта партнёры з гэтага праекта, якія прысвяцілі выпуск 17 лістапада цалкам і выключна Святлане Бароўскай. Калегі не толькі літаральна засыпалі вядучую кветкамі, але таксама прыгадалі шмат цікавых гісторый пра імянінніцу, паказалі гледачам мноства ўрыўкаў відэазапісаў мінулых гадоў, падрыхтавалі музычныя віншаванні, чым расчулілі Бароўскую да слёз. «Дзякуй вам, дарагія! Гэта так здорава — нічога не чакаць і атрымаць усё самае лепшае!» — прызналася расчуленая вядучая. Не засталіся ўбаку і тэлегледачы, якія спецыяльна для святочнага выпуску праграмы даслалі праз сацыяльныя сеткі больш як 30 маляваных і фотапаштовак з віншаваннямі і добрымі пажаданнямі.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**



# КІНАМЕНЮ НА РОЗНЫ ГУСТ

**Што: трылер «Факультэт»**
**Калі і дзе: СТБ, 25 лістапада ў 23.05**



*Фірменна страшны і адначасова іранічны фільм ад Роберта Радрыгеса, які адны гледачы адносяць да культавых стужак XX стагоддзя, другія ж лічаць слабенькай спробай спалучыць маладзёжную камедыю, фантастыку і фільм жахаў.*

...Група навучэнцаў самага звычайнага амерыканскага каледжа ў адзін далёка не цудоўны момант робіць жахлівае адкрыццё: іх навучальная ўстанова — маленькі філіял пекла, дзе ўсе выкладчыкі — не людзі, а прышэльцы, якія захапілі чалавечыя целы. Больш за тое, экспансія працягваецца, і вось ужо сярод саміх студэнтаў адна за адной з'яўляюцца іншапланетныя пачвары. Падлеткі, якія зусім нядаўна варагавалі, вымушаны пераглядзець некаторыя жыццёвыя арыенціры і аб'яднацца, каб справіцца з вонкавым злом. Улічваючы, што пры гэтым рэжысёр умела кпіць з «пакалення пепсі», а хэпі-энд забяспечвае апошні лузер каледжа, глядзець «Факультэт», як мінімум, не сумна.

**Што: меладрама «Пластмасавая каралева»**
**Калі і дзе: РТР-Беларусь, 26 лістапада ў 22.40**



*17-гадовай Машы Громавай у яе родным правінцыйным гарадку завочна далі мянушку Пластмасавая прынцэса. А як інакш, калі тата ў Машы — уладальнік буйнога, можна сказаць горадаўтваральнага завода па вытворчасці пластыку. Дзяўчына ж, нягледзячы на свой статус і зайздрасць блізкіх сябровак, закахалася ў простага хлопца і хоча звязаць з ім сваю будучыню. Бацькі падманам разлучаюць парачку і адпраўляюць Машу вучыцца ў сталіцу.*

Калі ж праз пэўны час дзяўчына вяртаецца, то застае вялікія і малапрыемныя перамены. У бацькі відавочна не ўсё ладна як у сям'і — стасункі з жонкай усё больш нагадваюць халодную вайну, так і на прадпрыемстве — пажылога, вельмі вопытнага і мудрага кіраўніка чамусьці змяніў малады праныра. Апошні пачынае заляцацца да Машы, але тая, хоць і бачыць былога каханага разам з былой жа сваёй сяброўкай, раптам усведамляе, што ранейшае пачуццё нікуды не падзелася...

**Што: мюзікл «Лятучая мыш»**
**Калі і дзе: «МІР», 26 лістапада ў 10.45, 22.35**



*Пакаленню, якое добра ведае, што лятучая мыш мае дачыненне не толькі да супергероя — ратаўніка свету, гэту вядомую аперэту Яна Фрыда двойчы прадстаўляць не трэба. Ну, а ўсім астатнім паглядзець яе будзе карысна хоць бы дзеля пашырэння кругагляду.*

Цудоўная музыка — не чыя-небудзь, а самога караля вальсаў Іагана Штрауса, танцы, бляск, смех і жарты, лёгкі флірт і маскі навокал — такі ён, баль-маскарад. У аперэце па законах жанру можа адбыцца што заўгодна: напрыклад, у выніку розыгрышу дырэктара тэатра пакаёўка ператвараецца ў баранесу, нягеглы студэнт трапляе ў турму замест банкіра, а лавелас-муж нечакана здраджвае ўласнай жонцы з... ёй самой. У выніку пакаёўка атрымае месца на сцэне, студэнт — свабоду, а муж — дараванне ад каханай, і ўсё гэта будзе настолькі прыгожа і весела, што, далібог, грэх не паглядзець ■

## Панядзелак, 21 лістапада

### 1 Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.20** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Увядзення ў храм Прасвятой Багародзіцы.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Клуб рэдактараў.
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10 Меладрама «Рыта».**
**14.15, 16.10 Серыял «Сваты-2».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** «Форум» з Дзмітрыем Бачковым.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**0.00** Дзень спорту.
**0.10 Серыял «Гетэры маёра Сакалова».**

### 2 Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.00, 22.10** Тэлебарометр.
**9.05** Сіткам «Розныя». Заключны серыі.
**10.30, 18.00 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**11.35 Серыял «Шчаслівыя разам 3».**
**13.25 Серыял «Косці».**
**17.00, 22.15 Дэтэктыў «Падмані мяне 3».**
**19.15** Суперлата.
**20.05** Рэпарцёр.
**20.55** «Сям'я». Рэаліці-шоу.
**22.05** КЕНО.
**23.15 Драма «Добрай ночы».**

### 3 Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Пірог «Трухлявы пень».
**8.05, 11.10, 21.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.10 «Доктар Жывага». Драма.**
**9.10 «Гензэль і Грэтэль». Казка.**
**10.05** М/ф.
**10.40** «Свято далёкай зоркі». Памяці мастака-графіка Сямёна Геруса.
**11.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**12.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.45, 21.25 «Іван». Драма.**
**14.00** «Артысты — фронту». Дак. фільм.
**14.35 «Адна ноч». Кінанавела.**
**15.20 «Кай са скрыні». Камедыя.**
**16.45** «Камертон». Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Таццяна Ліхачова.
**17.15** «У гасцях у Барыса Аверына».
**18.05** «Размаўляем па-беларуску».
**19.00 «Гваздзік». Драма.**
**20.00** «Подых струн».
**20.40** «Калыханка».
**21.20** «Час кіно».
*На тэлеканале «Беларусь 3» па Брэсцкай і Гомельскай абласцях з 21 па 25 лістапада 2016 г. з 19.00 да 20.00 будуць трансліравацца абласныя тэлепраграмы.*

### 5 Беларусь 5

**8.00, 18.45** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Аматар» (Брэст) — «Лідсельмаш» (Ліда).
**9.45** Хакей. КХЛ. «Слован» (Браціслава) — «Дынама-Мінск».
**11.40** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. УНІКС — ВЭФ.
**13.20** Фактар сілы.
**13.50** Змешаныя адзінаборствы. Чэмпіянат Беларусі па ММА.
**16.30** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Парма» (Перм) — «Цмокі-Мінск».
**18.15** Гандбол над Бугам.
**18.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. ХК «Гомель» — «Дынама» (Маладзечна).
**21.10** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**21.55** Час футбола.
**22.45** «Два бакі алімпійскага медаля». Уладзіслаў Ганчароў.
**23.20** «Жанчыны і спорт». Людміла Волчак.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здарова!»
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15** «Голас». Спецыяльны выпуск.
**1.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Наша справа».
**14.05** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**15.35 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Вялікі горад».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тайны Чапман».
**23.55 Маст. фільм «Летняя паездка да мора».**

### МІР

**6.30** М/ф.
**7.00, 2.25** «Экстрасэнсы. Па той бок іншага свету».
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Справа гастранома №1».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Чаму я?»
**13.45 Маст. фільм «Оскар».**
**15.30** «Мой лепшы сябар».
**16.10** Ток-шоу «Слова за словам».
**17.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**
**19.20 Серыял «Хто памнажае смутак».**
**22.00 Маст. фільм «Кука».**
**23.45 Маст. фільм «Танцуй, танцуй».**
**2.55 Серыял «Невідзімкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** Ток-шоу «Што адбываецца».
**12.40** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Сваты».**
**19.10, 20.40 Серыял «Шапавалаў».**
**21.45, 23.10 Серыял «Чорная котка».**
**23.40** «Спецыяльны карэспандэнт».
**0.25** «Расследаванне Эдуарда Пятрова».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**7.25** «Студыя Юліі Высоцкай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 23.00** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**15.00** «Ты не паверыш!»
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Брат за брата».**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00** «Пазнякоў».
**0.10 Серыял «Марскія д'ябლы».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Драма «Эверэст».**
**13.00 Серыял «Цяжкі пясок».**
**13.55** «Дыялог з усім светам».
**14.30 Драма «Чорны прыгажун».**
**15.55, 19.15, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад»: «Гуфі».
**16.20** «Урокі жывой прыроды».
**16.30** Дак. серыял «Кошак не любіць нельга».
**17.10 Серыял «Крык савы».**
**18.05 Серыял «Фарго».**
**19.20 Серыял «Візіцёры».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Улада страху».**
**23.05 Серыял «Ганібал».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Машкіны страшылкі».
**8.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонінь».
**9.40** Камедыя «Шалёныя грошы».
**11.40, 17.00** «Уральскія пельмені».
**12.40** «Пашпарт за 24 гадзіны».
**13.50** Серыял «Мамачкі».
**16.00, 20.20** Серыял «Маладзёжка».
**19.10** Серыял «Кухня».
**21.30** Баявік «Грамабой».
**23.30, 5.00** Серыял «Тут нехта ёсць...»
**0.30** Серыял «Бязмоўны сведка».
**2.30, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**3.00** «Дурні і дарогі».
**3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.00** «Лаві момант».

### Культура

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Назіральнік».
**11.15** «Бібліятэка прыгод».
**11.30** «Чалавек-невідзімка». Маст. фільм.
**12.55** «Пешшу...» Масква калекцыйная.
**13.25** «Маланкі нараджаюцца на зямлі. Тэлевізійная сістэма «Арбіта». Дак. фільм.
**14.05** «Лінія жыцця». Аляксандр Сакалоў.
**15.10** Да 70-годдзя Вячаслава Пецуха. «Больш чым каханне».
**15.50** «Зігзаг удачы». Маст. фільм.
**17.10** «Зігзаг удачы Эміля Брагінскага». Дак. фільм.
**17.50** 70 гадоў з дня нараджэння скрыпача. Алег Каган і Наталля Гутман. Запіс 1981 года.
**18.30, 1.25** Сусветныя скарбы.
**18.45** «Атланты. У пошуках ісціны». «Хто з'еў рыбу ў Чорным моры?»
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Саці. Нясумная класіка...»
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.10** Юбілей Людмілы Зайцавай. «Астравы».
**21.50** «Тым часам».
**22.35** Ступені цывілізацыі. «Апошні прыстанак тампліераў». Дак. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Энігма. Прэзідэнт Зальцбургскага фестывалю Хельга Рабль-Штадлер».
**0.30** «Смяротная галізна». Дак. фільм.
**2.40** І.С. Бах. Італьянскі канцэрт.

### Настальгія

**6.00, 0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1976. 2009 год.
**7.05, 12.45, 14.45, 17.15, 20.20, 21.40, 23.00, 3.40** Музычная настальгія.
**7.40** «Зямля—Паветра». Аляксандр Маршал. 2003 год.
**9.00** «Быў час». 2008 год.
**10.00** Фільм-спектакль «Прыйшоў мужчына да жанчыны». 1990 год.
**12.00** «Эліта Краіны Саветаў». Аляксандр Градскі. 2007 год.
**13.10** «Праграма А». 1990 год.
**15.00** Маст. фільм «Водпуск у верасні».
**17.25** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2005 год.
**19.20** Маст. фільм «Раферці». 1-я серыя.
**20.45** Кінаčасопіс «Хачу ўсё ведаць!» 1974 год.
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**1.10** «Песня-76».
**2.10** Праграма «Тэма» з У. Ліcьевым: «Дзеці знакамітасцяў». 1992 год.
**4.00** «Колба часу».

### EuroSport 1

**7.15, 19.30** Снукер. Northern Ireland Open. Фінал.
**9.00, 10.30, 11.45, 18.00, 22.30, 2.15** Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-20).
**14.00** Фігурнае катанне. Этап Гран-пры.
**15.30** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
**21.10** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**0.00** Watts.
**0.45** Конны спорт. Кубак свету.
**1.55** Футбол. «ФІФА».

### Кінакамедыя

**0.10** Камедыя «Бамбіза Салмон».
**1.55** Меладрама «Prada і пачуцці».
**3.50** Камедыя «Псіхааналітык».
**5.45** Камедыя «Кахаю цябе на ўсіх мовах свету».
**7.30** Камедыя «Supeгнянь».
**9.00** Камедыя «Supeгнянь 2».
**10.40** Камедыя «Хочаш ці не?»
**12.20** Камедыя «Шэсць жонак Генры Ляфэя».
**14.00, 14.55, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Ёсць ідэя».
**17.55** Камедыя «Аб чым маўчаць дзяўчыны».
**19.30** Камедыя «Геніяльны тата».
**21.10** Камедыя «Здзелка».
**22.55** Камедыя «Пенелопа».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.05** «Доктар I...»
**8.35, 18.50, 2.25** «Асколкі». Серыял.
**10.10** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.55, 3.55** «Асцярожна, махляры!»
**12.25** «Без падману».
**13.15** «Пра што гавораць мужчыны». Камедыя.
**15.05** «Вакол свету. Месцы сілы».
**16.00** «Паненка-сялянка».
**16.55** «Вірус на продаж». Дак. фільм.
**17.45** «Тайны следства». Серыял.
**20.40, 1.40** «Ежа, я люблю цябе».
**21.35** «Рэвізора».
**22.35** «Гісторыі выратаванняў».
**23.10** «Звышнатуральнае». Серыял.
**23.55** «Відок». Фэнтэзі.
**4.20** «Нераскрытыя тайны».
**5.05** «Часова даступны».

### ТБ1000

**6.10, 17.30** Драма «Пах жанчыны».
**9.05** Камедыя «Кіраванне гневам».
**10.55** Трылер «З мяне хопіць».
**12.55** Драма «Там, дзе сэрца».
**15.00** Драма «Народжаны чацвёртага ліпеня».
**20.10** Фэнтэзі «Капітан Крук».
**23.00** Дэтэктыў «Перш чым я засну».
**0.40** Драма «Гульня з агнём».
**2.30** Меладрама «Непатрэбныя рэчы».
**4.10** Драма «Гульня ў імітацыю».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Шапіто-шоу: павага і супрацоўніцтва».
**8.20** Меладрама «Артыстка».
**10.10** Трылер «Вій 3D».
**12.25** Драма «СВ. Спальны вагон».
**14.00** Камедыя «Падкідыш».
**15.15** Драма «Сіндром Пятрушкі».
**17.05** Камедыя «Ржэўскі супраць Напалеона».
**18.35** Драма «Пячорын».
**20.20** Меладрама «Бумеранг».
**22.20** Меладрама «Дзённік яго жонкі».
**0.20** Драма «Дачка».
**2.25** Драма «Дом на абочыне».
**4.30** Трагікамедыя «Неадэкватныя людзі».

### National Geographic

**6.00** Чалавек супраць YouTube.
**6.45, 13.25** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 14.10** Непаражальныя канструкцыі.
**8.40, 11.50, 14.55** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**9.25, 17.05** Марс. Прызямліліся.
**10.20, 18.00** Год у адкрытым космасе.
**11.05** Дзікі тунец.
**12.40** Гульні розуму.
**16.30, 19.30, 23.30, 3.30** Расследаванні авіякатастроф.
**18.45, 22.45, 2.45** 2000-я: час, калі мы ўбачылі ўсё.
**20.10** Зборнік «Гульняў розуму».
**21.00, 1.00, 4.10** Сёмы кантынент. Антарктыка.
**21.55, 1.50, 5.10** Гады небяспечнага жыцця.
**0.10** Уварванне на Зямлю.

### Discovery

**8.00, 14.00** Аляска: сям'я з лесу.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30** Багажныя войны.
**11.00** У пошуках скарбаў.
**12.00** Выжыць разам.
**13.00** Голыя і напалоханыя.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Востраў.
**23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 6.20** Што было далей?
**1.30, 6.45** Звышчалавечая навука.
**2.00, 4.40** Самагоншчыкі.

## Субота, 26 лістапада

### Беларусь 1

6.15 Існасць.
6.40, 21.40 Меладрама «Не шкадую, не заву, не плачу».
8.30 Буйным планам.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Клуб рэдактараў.
9.50 Серыял «Сваты-3».
11.05 50 рэцэптаў першага.
12.10 Вялікі сэлфі-тур.
12.50 Трансфармацыя.
13.25 Гісторыі рамонту.
14.05 Здароўе.
15.15 Краіна.
15.45 Меладрама «Выратаваць мужа».
19.05 Меладрама «Каханне да запатрабавання».
21.00 Панарама.
1.15 Дзень спорту.

### Беларусь 2

7.05 Серыял «Сябры анёлаў».
7.35 «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
8.35, 23.55 Тэлебарометр.
8.40 Серыял «Шчаслівыя разам 3».
10.40 Анімацыя для ўсёй сям'і. «Сезон палявання».
12.10 Капейка ў капейку.
12.45 «Нядбайнікі». Пазнавальна-забаўляльнае шоу.
13.20 «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
14.30 «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
15.45 «Бітва экстрасэнсаў. 13 сезон».
17.50 «Сям'я». Рэаліці-шоу.
19.15 «Здзіві мяне 3». Талент-шоу. Заключны выпуск.
21.10, 22.05 Баявік «Новы Чалавек-павук: высокае напружанне».
22.00 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
23.50 Хачу ў тэлевізар!
0.00 Драма «Выкуп».

### Беларусь 3

7.35 «Беларуская кухня». Мазёха. Каўбаса, пальцам тыканая.
8.00, 12.55, 21.00 «Калейдаскоп». Навіны культуры.
8.20 «Укол парасонам». Камедыя.
9.50 «Край».
10.15 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
10.50 «Я хачу гэта ўбачыць!» Гомель.
11.15 «Навукаманія».
11.40 «Размаўляем па-беларуску».
11.45 «Заапаркі свету» з Іванам Карнеевым.
12.15 «Апошні дзень». Нона Мардзюкова.
13.10 «Тэатр у дэталях». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Чайка».
13.30 «Подых струн».
14.10 Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-2008», «Славянскі базар у Віцебску-2009».
15.55 «Легенды музыкі». Максім Дунаеўскі.
16.20 «Дзікае паляванне караля Стаха». Драма.
18.30 «Заўтра была вайна». Драма.
19.55 «Дунькін полк». Дак. фільм.
20.40 «Калыханка».
21.20 «Час кіно».
21.25 «Восеньская саната». Драма.

### Беларусь 5

8.00, 20.45 PRO спорт. Навіны.
8.10 Піт-стоп.
8.35 Слэм-данк.
9.05 Баскетбол. Еўраліга. ЦСКА (Расія) — «Басконія» (Іспанія).
10.45 «Два бакі алімпійскага медаля». Уладзіслаў Ганчароў.
11.15 Баскетбол. Еўраліга. «Панацінаікас» (Грэцыя) — «Дарушшафака» (Турцыя).
12.55 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Шахцёр» (Салігорск).
15.00 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Хімкі» (Маскоўская вобл.)
16.55 Хакей. КХЛ. «Тарпеда» (Ніжні Ноўгарад) — «Дынама-Мінск».
19.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
19.45 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд.
20.55 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 5-ы тур.
22.55 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 5-ы тур.

### АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00 (з субцітрамі), 16.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
9.05 М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
9.25 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.00 «Ідэальны рамонт».
11.55 «Разумніцы і разумнікі».
12.40 Тэлечасопіс «Гумарынка».
12.50 «Найлепш за ўсіх!»
14.05, 16.20 Серыял «Прынц Сібіры».
16.15 (з субцітрамі), 21.00 Навіны спорту.
17.45 «Хто хоча стаць мільянерам?»
18.50 «Мой бізнес».
21.05 «Сёння ўвечары».
22.20 «Усё складзецца».
23.05 «Падары жыццё».
0.40 «Падмаскоўныя вечары».

### СТБ

6.35 «Неудачников.net». Серыял.
8.15 Маст. фільм «Майская ноч, або Тапельніца».
9.20 «Рамонт па-сумленнаму».
10.00 Дакументальны праект: «Ежа багоў».
11.00 «Мінск і мінчане».
11.35 «Дэмбельскі альбом». Серыял.
13.30, 16.30, 19.30 «24 гадзіны».
13.45, 1.55 Драма «Апошні дзюйм».
15.25 «Вадзіць па-руску».
15.55 «Вялікі горад».
16.45 «Наша справа».
17.00 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
18.35 «Ежа. Тэрыторыя змовы».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Падкідны». Серыял.
23.20 Трылер «Джэк Браўн».

### МІР

6.00, 8.20 М/ф.
6.10 Маст. фільм «Сем нявест яфрэйтара Збруева».
7.55 «Саюзнікі».
9.00 «Вой, мамачкі!»
9.30 «Мой лепшы сябар».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Здабыткі рэспублік».
10.45, 22.35 Маст. фільм «Лятучая мыш».
12.40 «Цяжар абеду».
13.10, 1.05 Маст. фільм «Любімы Раджа».
16.15 Серыял «Неадкладная дапамога».
3.00 Маст. фільм «Ведзьмы краіны Оз».

### РТР—Беларусь

7.00 «Сямейны альбом».
7.45 Маст. фільм «Пяшчотны Барс».
11.00, 14.00 Весткі.
11.20 Камедыя «Дванаццатая ноч».
13.15, 14.15 Маст. фільм «Дублёрка».
17.00 «Суботні вечар».
19.00 «Карціна свету».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.00 Весткі ў суботу.
20.55 «Аншлаг і Кампанія».
22.40 Маст. фільм «Пластмасавая каралева».

### НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 8.20 Дэтэктыў «Злачынства будзе раскрыта».
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.45 «Стрынгеры НТБ».
9.15 «Вуснамі дзіцяці».
10.25 «Галоўная дарога».
11.05 «Ежа жывая і мёртвая».
12.05 «Кватэрнае пытанне».
13.15 «Падвойныя стандарты».
14.15 «Паедзем, паядзім!»
15.05 НТБ-бачанне. «Алег Лундстрэм. Жыццё ў стылі джаз».
16.25 «Аднойчы...»
17.10 «Сакрэт на мільён». Віктар Логінаў.
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
19.55 «Новыя рускія сенсацыі».
20.50 «Ты не паверыш!»
21.40 «Кіно-шоу».
0.05 «Таямнічая Расія».

### 8 канал

9.00, 15.55, 19.10, 21.10, 23.30 «Надвор'е».
9.05 М/ф «Кошкін дом».
9.30 «Даведнік па краінах і кантынентах».
9.40 Камедыя «Канікулы».
11.15 Прыгоды «Шэсць дзён, сем начэй».
13.00 «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Захавальнікі сноў».
14.30 Серыял «Аднойчы ў казцы».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Серыял «Айцец Браўн».
17.25 М/с «Іван і Мітрафан».
17.40, 19.15 Серыял «Дзіўнае падарожжа». 1—2-я серыі.
20.50 «Вечарніца».
21.00 «Фэшн is my прафэшн».
21.15 Прыгоды «У глыбіні мора».

### ВТБ

6.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
6.30 «Мой тата крутейшы!»
7.30 «Ералаш».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.15 М/ф «Маша і мядзведзь».
8.30 М/ф «Брыдкае качаня і я».
9.00 «Вялікая маленькая зорка».
10.00, 1.20 «Турбаміксер».
12.00 Серыял «Сям'я 3D».
13.00 Серыял «Мамачкі».
15.10 Баявік «Рэкрут».
17.30 М/ф «Джасцін і рыцары доблесці».
19.30 Фэнтэзі «Іншы свет».
21.50 «Уральскія пельмені».
23.30 Дэтэктыў «Трохвугольнік».
4.00 «Дурні і дарогі».
4.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
5.30 «Лаві момант».

### Культура

6.30 «Еўраньюс».
10.00 Біблейскі сюжэт.
10.35 «Давай пажэнімся». Маст. фільм.
11.55 «Юрый Назараў». Дак. фільм.
12.35 «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
13.05 «Душа Расіі». Гала-канцэрт у Канцэртнай зале імя П.І. Чайкоўскага.
14.35 Аляксей Сіманаў «Кавалачкі жыцця... Юрый Нікулін».
15.00 «Бывай, стары цырк». Дак. фільм.
16.15 «Гульня ў бісер». «Фазіль Іскандэр. «Трусы і ўдавы».
17.00 Навіны культуры.
17.30 «Музеі Ватыкана. Паміж небам і зямлёй». Дак. фільм.
18.35 «Рамантыка раманса». Аляксандру Фляркоўскаму прысвячаецца...
19.30 «Два Фёдара». Маст. фільм.
21.00 Вялікая опера — 2016.
22.55 «Белая студыя».
23.35 Кіно на ўсе часы. «Чырвоны круг». Маст. фільм.
1.55 «Шукальнікі». «Загадка Паўночнай Шамбалы».
2.40 Сусветныя скарбы.

### Настальгія

6.00 «Эліта Краіны Саветаў». Аляксандр Зацэпін. 2007 год.
6.50, 8.20, 9.40, 11.00, 13.00, 14.45, 15.40, 17.00, 19.00, 21.50, 23.20, 0.55, 2.20, 3.40 Музычная настальгія.
7.05 Маст. фільм «Збягаючы жнівень».
8.30 Дак. фільм «Эканоміка ў пошуках ісціны».
9.00, 15.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00, 18.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1981. 2010 год.
13.20 «Дванаццаты паверх». Праграма для моладзі. 1988 год.
16.00 «Колба часу».
19.15 «Праграма А». 1990 год.
20.50 «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». 1990 год.
21.00 «Быў час». 2008 год.
22.10 Фільм-спектакль «Алі-Баба і 40 разбойнікаў». 1983 год.
0.00 «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. «Творчасць Уладзіміра Высоцкага». 2005 год.
1.15 Маст. фільм «Раферці». 3-я серыя.
2.45 Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!» 1975 год.

### EuroSport 1

3.30, 6.30, 9.45 Аўтаспорт. Серыя WTCC.
5.00, 11.15, 13.45, 17.45, 2.00 Скачкі з трампліна. Кубак свету.
8.00 Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-20).
9.30 Watts.
12.00, 16.15 Санны спорт. Кубак свету.
12.45, 17.00 Лыжнае дваяборства. Кубак свету.
14.15 Лыжныя гонкі. Кубак свету.
19.50 Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
22.30 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
23.15 Снукер. UK Championship.
1.05 Зімовыя віды спорту.

### Кінакамедыя

0.35 Камедыя «Псіхааналітык».
2.30 Меладрама «Каханне з перашкодамі».
4.25, 15.40 Скетчкам «Паміж намі».
5.20 Камедыя «Ракавая Лара».
7.20 Камедыя «Татулі без шкодных звычак».
9.10 Камедыя «Вох, ужо гэтыя дзеці».
10.50 Камедыя «Вох, ужо гэтыя бацькі».
12.25 Камедыя «Вох, ужо гэты адпачынак».
14.00 Меладрама «Па прыкмеце сумяшчальнасці».
16.00 Камедыя «Модная штучка».
17.50 Камедыя «Палета».
19.25 Камедыя «Дзядуля лёгкіх паводзін».
21.15 Фантастыка «Жалезнае неба».
22.55 Меладрама «Выпадковы муж».

### ТБ3

6.00 М/ф.
10.00 «Хронікі маскоўскага побыту».
10.55 «Доказ віны».
11.30, 1.10 «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
15.20 «Тры волаты. Ход канём». Анімацыйны фільм.
16.40 «Зоркі. Тайны. Лёсы».
17.40 «Вакол свету. Месцы сілы».
18.35 «Вулічная магія».
19.10 «Рака памяці». Меладрама.
21.10 «Планета малпаў». Фантастыка.
23.20 «Звышнатуральнае». Серыял.
0.45 «Вулічная магія».
4.40 «Куміры. Назад у СССР». Дак. фільм.

### ТБ1000

6.10, 17.55 Драма «Няскораны».
8.25 Трылер «Прафесіянал».
10.25 Драма «Кінутая на волю лёсу».
12.10 Меладрама «Салодкі лістапад».
14.10 Меладрама «50 першых пацалункаў».
15.55 Фэнтэзі «Лабірынт Фаўна».
20.10 Драма «Матч Пойнт».
22.20 Драма «Залаты век».
0.20 Трылер «Ідэнтыфікацыя».
2.00 Драма «Саліст».
4.20 Фэнтэзі «Незвычайныя прыгоды Адэль».

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Камедыя «Рэальны тата».
8.10 Драма «Легенда №17».
10.40 Драма «Смяцяр».
12.35 Камедыя «Каін XVIII».
14.35 Меладрама «Яшчэ адзін год».
16.35 Камедыя «Зоймемся любоўю».
18.20 Драма «Агні прытона».
20.20 Камедыя «Хутчэй, чым трусы».
22.10 Фільм жахаў «Маршрут пабудаваны».
0.00 Камедыя «Хлопец з нашых могілак».
1.35 Драма «Партрэт у прыцемках».
3.20 Меладрама «Тры таварышы».
5.00 Драма «Марыяна».

### National Geographic

6.00, 6.20 Шырокі погляд.
6.10, 6.45, 12.50, 5.40 Навуковыя недарэчнасці.
7.30 Служба выратавання Аляскі.
9.45 Незвычайныя промыслы.
10.30 Дзікі тунец.
11.15 Міжнародны аэрапорт Дубай.
12.00 Чалавек супраць YouTube.
13.30 Зямля з космасу.
14.20 Марс. Нова Мунда.
15.20 Марс. Прызямліліся.
16.20 Год у адкрытым космасе.
17.10 Эвакуацыя Зямлі.
19.30, 3.10 Уварванне на Зямлю.
0.00, 4.00 Вядомы Сусвет.
1.40 Паранармальнае.

### Discovery

8.00 Выжыць пасля сэлфі.
9.00 Брудныя грошы.
11.00, 23.00 У пошуках скарбаў.
12.00 Выжыць разам.
13.00, 1.00 Голыя і напалоханыя.
14.00, 22.00 Аляска: сям'я з лесу.
15.00 На краі Аляскі.
16.00, 21.00 Як устроены Сусвет.
17.00 Космас навыварат.
18.00, 7.10 Хуткія і гучныя.
19.00, 0.00 Свяшчэнная сталь.
20.00 Вулічныя гонкі.
2.00 Вострaў.
4.40 У пагоні за класікай.

---

## Zамор'е

# СПОРТ І СВІННЯМ КАРЫСНЫ

**Кітайскі фермер навучыў сваіх свіней ныраць з вышкі, каб палепшыць іх здароўе і атрымаць больш смачнае мяса, паведамляе Daily Mail.**



Хуан Дэмін з правінцыі Хунань ужо чатыры гады прымушае свіней са сваёй фермы займацца спортам. Ён кожны дзень адводзіць іх да найбліжэйшай сажалкі і заганяе на трохметровую вышку. Жывёлы скачуць з яе ў ваду, а затым робяць некалькі кругоў па вадаёме. Фермер верыць, што такія практыкаванні развіваюць імунную сістэму свіней, таму яны радзей хварэюць. Акрамя таго, ад скачкоў і плавання ў жывёл павышаецца апетыт. У выніку яны больш ядуць і хутчэй растуць. На думку Дэміна, мяса «спартыўных» свіней больш смачнае і мае больш прыемную тэкстуру.

# РАЗБУРАЛЬНАЕ СЭЛФІ

**Турыст з Бразіліі так стараўся зрабіць удалае сэлфі са статуяй XVIII стагоддзя ў Нацыянальным музеі старажытнага мастацтва ў Лісабоне, што выпадкова разбіў яе. Мужчына так блізка падышоў да статуі архангела Міхаіла, што яна ўпала і раскалолася на некалькі частак.**



Адзін з наведвальнікаў музея сфатаграфаваў разбіты твор мастацтва і выклаў здымак у Facebook, напісаўшы: «Такая цана бясплатнага ўваходу ў музей у першую нядзелю кожнага месяца». Намеснік дырэктара Хасэ Альберта Карвальё прызнаўся, што з падобным інцыдэнтам ён сутыкнуўся ўпершыню. Паводле ацэнак экспертаў, прычыненая статуі шкода з'яўляецца непапраўнай. Яшчэ ў верасні Карвальё скардзіўся ўладам на недахоп работнікаў музея: «У нас усяго 64 наглядчыкі на 84 залы. Я проста ўпэўнены, што ў любы момант можа здарыцца бяда. І гэта адбудзецца, таму што мы нядбала ставімся да нашай спадчыны».

# ВЫКАПАЦЬ ХУТКА І ДАКЛАДНА

**У горадзе Трэнчын на захадзе Славакіі прайшоў міжнародны чэмпіянат сярод... далакопаў. Так, бываюць і такія спаборніцтвы. У іх бралі ўдзел каманды са Славакіі, Польшчы і Венгрыі, паведамляе Associated Press.**



Падчас конкурсу ўдзельнікі павінны былі капаць магілы строга вызначанага памеру: 150 сантыметраў у глыбіню, 200 сантыметраў у даўжыню і 90 сантыметраў у шырыню. Пры рабоце дазвалялася выкарыстоўваць толькі рыдлёўкі і кіркі. Суддзі ацэньвалі хуткасць і дакладнасць выканання задання. Перамогу атрымала славацкая каманда, якая складаецца з двух братоў. Яны не толькі спраўляліся з заданнямі хутчэй за іншых далакопаў, але і капалі самыя акуратныя магілы. «Я рады, што мы перамаглі, — прызнаўся адзін з братоў. — Гэта кампенсацыя нам за 15 гадоў працы».

**Іван КУПАРВАС.**

■ Простая мова

# ТВОЙ КРЫЖ — ГЭТА МОЙ КРЫЖ

**Класіка:**
***Усё ў жыцці мінае, зменна —***
***Прайшло. Мінула. Адплыло...***
***Але й дасюль яшчэ прыемна,***
***Што гэта некалі было.***
**...Мы тады адляталі. Маршрут — «Вільнюс—Барселона». Месцы — у хвасце самалёта, але (што, вядома ж, добра) адно — ля акна. *За* ім, як заўсёды, плылі аблокі. А *на* ім (як ніколі) — сядзеў... камар. Маленечкі, смешны ён трымаўся лапкамі за шкло і таксама ляцеў — за блізкі свет, у невядомасць, адзін...**
**Як кожны з нас.**

## СЛЕД НА ЗЯМЛІ

Гэта, відаць, выдаткі прафесіі — у любым напісаным тэксце міжволі шукаць памылкі.

То сказ пачынаўся так: «Арлоўскі сват майго брата...»

Далей — не чыталася, бо не хапала знака прыпынку. Вярнулася назад: «Арлоўскі...» Так і ёсць, дакладней — няма — коскі альбо працяжніка.

Прачытала наноў і толькі тут сцяміла, што размова, відаць, не пра нашага Кірылу Пракопавіча — а пра свата, які проста жыве на Арлоўшчыне...

Дзіўныя шалі, ці не так? Там, у Арлеці вобласці, тысячы людзей! Тут, у Беларусі, можна сказаць, адзін чалавек — легендарны старшыня легендарнага калгаса. А бач ты — пераважыў!

Нават для наступнікаў, праз дзесяцігоддзі.

## ЧАС ВЫНАХОДНІКАЎ

Панядзелак дзень няўдалы. З раніцы і — сапраўды, бо пакуль даехала на працу (з адной перасадкай), у тралейбус тройчы зайшлі кантралёры, тройчы праверылі праязны.

Ён заўсёды быў і, вядома ж, ёсць; лянуецца недалёка і паказаць яго няцяжка. Але ж для гэтага трэба адарваацца ад чытання, згарнуць кніжку, адкрыць сумку. І калі б адзін раз...

— А зрэшты, — што наракаць пасажырам?..

Іншая рэч, калі той жа кантроль «дастае» на працы... І цаглін пад рукою няма!

Прычым тут яны?

Пісьменнік Алесь Зайка расказваў, што ў адным з мястэчковых клубаў пячное ацяпленне было — дзве грубкі. І ў іх — (зноў жа дзве) — «кантрольныя» цагліны. Перад чарговай праверкай яны вымаліся, грубкі, як па камандзе, пачыналі дыміць...

Працаваць у такім вось задымленым памяшканні «рэвізоры» не маглі, а таму спехам пісалі нешта накшталт: «...Пячное ацяпленне патрабуе правядзення рамонтных работ» і адразу з'язджалі назад.

Пасля чаго загадчык клуба хуценька клаў цагліны на месца, расчыняў дзверы, каб выветрыць чад, і працаваў сабе далей. Працаваў доўга, працаваў творча — паводле прымаўкі: «Хто пытае, той не блудзіць, хто шукае, той знаходзіць».

І «цагліны» ў печы таксама.

## ЗА ЗДАРОЎЕ!

Пытанне армянскаму радыё: калі наш мужчына купляе новы спартыўны касцюм?

Адказ: калі збіраецца ў санаторый альбо кладзецца ў бальніцу.

Ні туды, ні туды Аляксеевіч не збіраўся, а таму хадзіў у старым: добра, жонка майстрыха: латкі на каленях паставіла...

А тут, як на ліха, нейкі кашаль усчаўся, тэмпература ўверх папаўзла — пад 40... Давялося «хуткую» выклікаць, потым спешна збірацца — ехаць у бальніцу.

— Што з сабой браць? — спытаўся медыкаў.

Тыя казалі, ён складаў — той самы спартыўны касцюм, на ўсякі выпадак — цёплыя шкарпэткі, тапкі, ручнік, кубак, лыжку, зубную шчотку... Здаецца, нічога не забыў?

І ў бальніцы, дзякаваць Богу, не затрымаўся. Зрабілі там патрэбныя аналізы, прызначылі антыбіётыкі. Тыдзень — з панядзелка па пятніцу — пакалолі і як быццам ажыў чалавек: ва ўсякім разе перад выхаднымі, што называецца, выпрасіўся з бальніцы.

...Жонка з сынам, вядома ж, рады былі: святочную вячэру зрабілі. А сталі затым яго рэчы разбіраць, — лыжка на падлогу выпала.

— Ты што, — здзівілася жонка, — з сабою чайную браў? Чаму?

— Можна падумаць, я ў бальніцах ляжаў... Адкуль мне ведаць, якую трэба?

— І што — ёю суп еў?

— Ну...

— Цырк... Маленькай лыжачкай, — зарагаталі сямейнікі, — у залатаных портках?.. Дык вось чаму ты дома!

...«За здароўе!» — гэта, кажуць, самы распаўсюджаны тост.

А ў медыкаў ёсць свой, адмысловы: «Каб бедныя ніколі не хварэлі, а багатыя — не папраўляліся».

## ЗАРАБІЎ...

Вечар, кухня, тупаніна... Па тэлевізары — фонам — выпуск навін. Нешта з іх цягам дня ўжо чутае, нешта — звычнае... «Чапляе» хіба адно: нейкія «добрыя» дзядзькі прапанавалі юнаку падзарабіць на фасоўцы наркотыкаў. Ён згадзіўся. І, як для падлетка (15 гадоў), дык сапраўды зарабіў: каля 6 мільёнаў (на старыя грошы).

І — да... 12 гадоў турмы — для сябе, для родных, для ўсіх, хто яго любіў...

Гэта — без каментарыяў, як той казаў, бо няма для іх слоў.

## ЖЫЦЦЁ КАРОТКАЕ

Дом той знаходзіцца ў горадзе, а людзі жывуць — нібы ў вёсцы, бо тры пад'езды ўсяго, два паверхі. Як на далоні ўсё — і ёсць, і было.

Ад цётачкі Надзі, у прыватнасці, муж сышоў гадоў сорак таму, ёй дзіцятка пакінуў — сына. Аліментаў не плаціў, так што працаваць давялося самой — і цяжка, і шмат.

А ўсё для чаго? Для таго, каб яму, маленькаму (бо каму ж яшчэ?!) купляць і найлепшыя цацкі, і першыя ягадкі... Каб потым яму — ужо даросламу — адпраўляць па пошце кожны «вольны» рубель.

Сын прымаў іх — і ў 20, і ў 30, і значна пазней. Прыняўшы, нязменна дзякаваў і гэтак жа нязменна абяцаў у хуткасці прыехаць — не на пару дзён, а на пару тыдняў, з сям'ёй; дома, з ёю пажыць, зрабіць рамонт у кватэры.

Маці, вядома ж, верыла і, вядома ж, чакала. Уяўляла, як тое спраўдзіцца, як яны з ім урэшце нагавораца, як пабеляць столі (хоць бы ў кухні...), памяняюць шпалеры і як яна ў чыстай хаце тады зажыве.

Такія былі «мары-кралі». Але ж праўдай яны не сталі. Не прычакала маці абяцанага прыезду, лёгка сышла — сэрца.

Сын пасля гэтага адразу ж з'явіўся (як і належыць, з сям'ёй). І ўсё, што трэба, зрабіў — ніхто не папракне... На вячэру яшчэ суседзяў паклікаў.

Назаўтра таксама без справы не сядзеў: разам са сваімі з'ездзілі на могілкі, параносілі па кватэрах пазычаны посуд ды крэслы...

А на паслязаўтра ўжо і да іншых рэчаў чарга дайшла: сталі выносіць на сметніцу старыя вываркі-патэльні, дыванкі-дарожкі, запасы круп...

Суседзі паспрабавалі было спыніць, сказаць, што гэта нядобра, што трэба пачакаць — ну хоць сорак дзён.

— А чаго, — не зразумеў той сын, — калі нам усё роўна гэта не трэба, а маці ж не вернецца?

...Шкадуюць яе суседзі, бо, кажуць, добрая была жанчына. І з гумарам: ва ўсякім разе любіла паўтараць, што чалавечае жыццё — як дзіцячая кашулька: заўсёды кароткая і ўнізе (у канцы) заўсёды ў...

Ну, вы здагадаліся.

## «АБЛОМ»

Кавалеры ў Леры, вядома ж, былі: некаму падабалася яна, нехта ёй...

Апошні — найбольш, бо, здавалася, усё пры ім: і прыгожы, і разумны, і добры. І да яе з адкрытай душой: пастаянна то з кветкамі, то з падарункамі, з прапановамі некуды схадзіць...

Яна згаджалася і ўжо марыла пра галоўную: вось-вось яе хлопец стане на калена, вось-вось, як у кіно, працягне ёй чырвоную каробачку з пярсцёнкам, скажа:

— Ты выйдзеш за мяне?

...Надоечы яны на экскурсію разам з'ездзілі. Ёй спадабалася, хоць і змерзла: прыйшлося яго пальчаткі надзець — наверх на свае.

Потым ён дадому яе праводзіў. І ў пад'ездзе доўга трымаў — цалаваліся.

Урэшце яна «адарвалася» — стала дзверы свае адчыняць, а ён пад руку:

— Стой!

У дзеўкі — сэрца з грудзей: яна аж вочы заплюшчыла, каб лепей пачуць — ну тое, галоўнае...

Ён сказаў:

— Пальчаткі аддай.

Моўчкі працягнула.

Ён — узяў і пайшоў — па прыступках, уніз, на першы паверх. З якога, як здалося, няма больш дарогі «наверх».

## ЁСЦЬ РАЦЫЯ...

Пра надвор'е маўчыць хіба прас, а ўсё астатняе — радыё, тэлевізар, інтэрнэт — толькі ўключы, толькі разгарні газету, — адусюль інфармацыя пра дажджы і градусы, пра снягі і мяцеліцы... І хоць бы праўдзівая!

А зрэшты...

Рэмарк пісаў: «Кветкі павінны быць без нагоды. Шчасце павінна быць сапраўдным. Дом — цёплым. Каханне павінна быць узаемным. Надвор'е, ды без розніцы, якое надвор'е».

І сапраўды.

## ТВОЙ КРЫЖ — ГЭТА МОЙ КРЫЖ

...Што спачатку, што потым, хіба разбярэш? Магчыма, ён без памяці закахаўся, а потым даведаўся, што дзяўчына яго, так бы мовіць, даўно не дзяўчына — удава, двое дзяцей на руках і хворая свякроў...

А магчыма, усё наадварот: ён спачатку даведаўся, што яна ўдава... А ўжо потым закахаўся і паклікаў замуж.

Не адразу пайшла: казала, што яны не пара, што дзеці ў яе — двое, хлопчык і дзяўчынка (для яго — чужыя), што не кіне свякроў, бо ў той больш нікога няма, што яна ўжо прывыкла цягнуць гэты воз, што такі яе крыж...

У яго міжволі тады сарвалася:

— Твой крыж — гэта мой крыж, а інакш не стаў бы і гарод гарадзіць.

Сказаў і забыўся...

Пажаніліся. Зажылі. Ёй — нібы свет нанова адкрыўся! Ды і яму цікавей неяк стала. Захацелася болей зарабляць, бо кожны рубель стаў ісці ў сям'ю, захацелася жытло у парадак прывесці, кожны дзень па гаспадарцы нешта зрабіць. А ўжо з дзецьмі пагуляць ды ўрокі праверыць — дык гэта ж не работа, гэта задавальненне адно...

Праўда, скончылася неяк хутка: не паспелі азірнуцца, як выраслі тыя старэйшыя. І нават малодшы...

Цяпер у іх іншы клопат, а можа, і бяда: яго матуля нагу зламала, тую самую шыйку сцягна. Не ўстае і — дактары сказалі — наўрад ці ўстане. Трэба даглядаць. Ляжачую.

Сын збіраўся рабіць гэта сам, не вешаць клопат на жонку. Але гэтым разам ужо яна (міжволі ці не?) паўтарыла яго-ныя словы:

— Твой крыж — гэта мой крыж... А інакш — сям'я не сям'я.

**Валянціна ДОЎНАР**

■ Неасабісты суб'ектыў

# З ДАСТАЎКАЙ НА ДОМ



## Уключаем гаджэты — адключаем мазгі?

РАСКАЖУ вам, як мы ўчора няўдала ў тэатр схадзілі. Не, вы не падумайце, у самім тэатры было ўсё на вышыні: і пастаноўка паводле Мележа спадабалася — зроблена, як умеюць рабіць купалаўцы: калі ўсіх шкадуеш, нават самых адмоўных герояў, — і акцёры іграні так, што гледачы пасля доўга стоячы апладзіравалі і не адпускалі іх са сцэны. Каб не псаваць уражанне ад прыемнага вечара ў поўным вагоне метро і мерзнучы на тралейбусным прыпынку, вырашыла (гуляць, дык гуляць!) выклікаць таксі. Што, здавалася б, можа быць прасцей у цэнтры еўрапейскай сталіцы. У выніку атрымалася ўсё па самым распаўсюджаным на любую жыццёвую сітуацыю прынцыпе: не кажы «гоп»...

Утульна ўладкаваўшыся на паласатай канапцы ў фае тэатра, я набрала нумар аднаго з вядомых сталічных перавозчыкаў. «Мне, калі ласка, машыну да ўвахода ў Купалаўскі тэатр». «Калі ласка, дыктуйце адрас», — ветліва так адказвае аператар. Ачомаўшыся ад нечаканасці, нават крыху адчуваючы сябе вінаватай (колькі разоў была ў тэатры і не пацікавілася, у якім нумары дома ён знаходзіцца! Проста жах!), вымавіла ў адказ: «Дакладна на вуліцы Энгельса, нумар будынка не памятаю. Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. У Мінску і ў Беларусі адзін такі, не пераблытаеце...» «Скажыце дакладна нумар дома!» — чалавек на тым канцы провада нават не спрабаваў зразумець маю іронію. «Не ведаю... няхай будзе... шэсць. Купалаўскі тэатр!» — апошнія словы вымавіла асаблiва выразна. «Добра, машына праз сем хвілін будзе», — не вельмі ўпэўнена, як падалося, адказаў аператар.

ПАДАЛОСЯ нездарма. Праз сем хвілін прыходзіць на тэлефон паведамленне: «Ваша машына пададзена». Выходзім у пранізліва-туманны змрок — таксі няма. Я нават на ўсякі выпадак і ў адзін бок прайшлася, і ў другі — можа, да службовага ўвахода машыну падалі. Таксі няма. Званю на нумар, з якога прыйшло паведамленне: «Вы дзе?» — «Я каля шостага дома. А вы дзе?» — у голасе кіроўцы — стрыманае абурэнне. Глянула за скрыжаванне — сапраўды, «шашачкі» каля будынка «Белтэлекама» стаяць. «Выбачайце, пабілыталa нумар дома. Мы каля Купалаўскага тэатра, пад'ездзе, калі ласка, сюды...» — «Добра, еду», — як падалося, зусім няўпэўнена сказаў таксіст.

Падалося нездарма. Далей пачаўся сапраўдны тэатр абсурду. Таксі (менавіта наша, светла-зялёны «пежо», як і было сказана) праехала міма, павярнула направа. Нічога, развaрочвацца паехаў, супакоіла сябе (хоць бачыла, як дагэтуль машыны разварочваліся перад тэатрам). Праходзіць хвілін пяць — званок: «Вы дзе?» — «Каля галоўнага ўвахода ў Купалаўскі тэатр!» (Цярпенне, як вы разумееце, ужо было на мяжы.) «А дзе гэта?» — «На вуліцы Энгельса, нумар дома дакладна не ведаю, пабач...» — я назвала гэтаму, так бы мовіць, таксісту, усе будынкі, размешчаныя вакол, згадала станцыю метро, сквер і нават танк каля Дома афіцэраў і фантан «Хлопчык з лебедзем»... — «Добра, зараз», — стомлена ўздыхнуў небарака.

Дарэмна я гэта зрабіла. Зусім збянтэжыўшы беднага. Ён з засяроджаным тварам зноў (не смейцеся!) праехаў міма, ужо нікуды не зварочваючы. Гэта было так знянацку, што я нават рукой не паспела махнуць. А ён падаўся далей, уніз па вуліцы, да трамвайных пуцей. Пачакаўшы дзеля прыстойнасці (можа, ён усё-ткі туды разварочвацца паехаў?) яшчэ некалькі хвілін, я, ужо ледзь трымаючы адубелымі пальцамі тэлефон, набрала нумар іншага перавозчыка. Там не сталі перапытваць адрас тэатра, а машына прыйшла вельмі хутка. Пакуль адагравалася ў салоне, кіроўца зялёнага «пежо» званіў яшчэ раз. Трубку я не зняла: няхай не ў адной мяне вечар выдаўся няўдалы, дый прыстойныя словы ў яго адрас усе як адно з галавы павыляталі, пэўна, ад холаду. Што вы хочаце: паўгадзіны на марозе ў асенніх чаравіках на тонкай падэшве...

«Скажыце, а вы ведалі, дзе ў Мінску Купалаўскі тэатр знаходзіцца?» — асцярожненька так спытала ў кіроўцы, што нас вёз, мужчыны гадоў за пяцьдзясят. Паглядзеў на мяне, як на дзівачку, а калі коратка расказала пра свае прыгоды, усміхнуўся з разуменнем. «Уся справа ў тым, што вы яму і аператару нумар дома не сказалі. Яны ж, маладыя, цяпер зусім мазгі не ўключаюць. Заб'юць адрас у навігатар — той ім увесь маршрут і намалюе, едуць па ім, ды і ўсё, нават па баках не глядзяць. Ім што тэатр вядомы, што забягалаўка на ўскраіне — усё роўна. Дакладны адрас ёсць — навігатар прывядзе. Няма — самі нізавошта не прыедуць, бо не ведаюць, бо так і жывуць: па дакладзе ў сеціве, па навігатары. Я вам шчыра скажу: калі раптам у гэтай спадарожнікавай сістэме які збой адбудзецца — таксі ў Мінску чакае глыбокі крызіс...»

КАБ жа толькі таксі! Сёння ў абед на Камароўку згойсала, сабравіны купіць. Села ў тралейбусе падлічыць, ці не абдурылі гандляры, даўно ўжо наяўнымі грашыма не плаціла: усё больш карткай. Ды бяда: мабільнік у кабінеце пакінула. А там жа калькулятар! Карацей, вы нават не ўяўляеце, як я ў памяці ад дваццаці рублёў сем рублёў трыццаць сем капеек адняць спрабавала. Мазгі, здавалася, праз вушы пацякуць. І выгляд, падазраю, ад такога неймавернага напружання ваша пакорная слуга не вельмі разумны мела. Узяла паперку і ручку, напісала лічбы ў слупок — мала дапамагло: не магла ўспомніць, што рабіць, калі кропачка над нулём стаіць. А ўсяго і патрабавалася — самае простае матэматычнае дзеянне без дапамогі тэхнікі выканаць.

Нядаўна сяброўка запрасіла на гарбату з «суперкексам», рэцэпт якога знайшла ў сеціве. «Вяршкі, свежыя клубніцы — смаката!» Пакуль цуда-булка пяклася ў духоўцы, размаўлялі пра выгады сучаснага жыцця. Маўляў, ні пра што клапаціцца не трэба: інтэрнэт дапамога і страву смачную прыгатаваць, і падкажа, як правільна цвік забіць, нават рамонт у хаце без спецыяльнай камп'ютарнай праграмы, якая разлічыць усё да апошняга сантыметра шпалераў, сёння ніхто не робіць...

...Замест смачнага печыва мы ў той вечар елі лыжкай салодкую ліпкую кашу з клубніцамі. Аказалася, аўтар рэцэпта ў інтэрнэце ненаўмысна ці знарок не запісаў у ім муку. А саракагадовая цётка, гаспадыня ў вялікай сям'і, нават не задумалася — рабіла ўсё, як напісана.

РАЗМАЎЛЯЛІ мы за тым пачастункам мала. Больш глядзелі на дзіўную ежу ў талерках, засяроджана яе калупаючы, і маўчалі. Думалі. Мазгамі. Якія, хоць і адключаючыся, але, дзякуй богу, не назусім. Пакуль што.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## Извещение о проведении открытого аукциона 20.12.2016 в 11.00

**по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. №204 по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на пять лет для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг.**

**Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87**

| Адрес арендуемого имущества | № Лота | Площадь, кв.м | Коэффициент от 0,5 до 3,0 | Начальная цена продажи, базовые арендные величины* | Размер задатка, базовые арендные величины* | Характеристика |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение, административное здание и склады, 2-й этаж, помещения; Гродненская обл., г. Гродно, ул. Карского, д. 12 | 1 | 33,0 в т.ч.: 21,7 11,3 | 3,0 | 8,25 | 0,825 | Помещения находятся на втором этаже двухэтажного кирпичного здания во второй зоне города. В помещениях имеется естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, телефонизированы. В здании имеется канализация, водоснабжение. Площади находятся в удовлетворительном состоянии. |
| Капитальное строение, административное здание и склады, 2-й этаж, помещения; Гродненская обл., г. Гродно, ул. Карского, д. 12 | 2 | 33,3 в т.ч.: 11,9 21,4 | 3,0 | 8,325 | 0,8325 | |
| Капитальное строение, склады, 1-й этаж, часть помещения, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Карского, д. 12 | 3 | 173,6 | 3,0 | 43,4 | 4,34 | Площадь находится на первом этаже одноэтажного кирпичного здания во второй зоне города. В помещении имеется естественное освещение, электроснабжение. Площадь находится в удовлетворительном состоянии. |

**Оплата в белорусских рублях, исходя из размера базовой арендной величины, установленной в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь на день оплаты.*

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заверенную банком копию платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц – нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

*Задаток перечисляется на субсчет 3012000040071 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 500826567 Гродненский филиал РУП «Белтелеком».*

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607), в размере 15% от начальной цены продажи соответствующего лота.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

**Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. 407 с 18.11.2016 по 19.12.2016 включительно в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 часов 19.12.2016, не рассматриваются.**

**Телефоны для справок: (0152) 606805, (0152) 606801, факс (0152) 72 02 07.**

## ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

*г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 129*

В соответствии с решением Общего собрания акционеров ОАО «Белтрубопроводстрой» установлена цена выкупа Обществом акций акционеров, не участвовавших в общем собрании или голосовавших против принятия решения о реорганизации ОАО «Белтрубопроводстрой» в соответствии с п.5.9 Устава – в размере номинальной стоимости акций.

Срок, в течение которого акционеры могут предъявить требование о выкупе акций, составляет 40 дней с даты публикации данного объявления. Письменное требование Акционера о выкупе принадлежащих ему акций должно содержать фамилию, собственное имя и отчество (наименование) и подпись Акционера (подпись должностного лица Акционера – юридического лица, скрепленная печатью), а также количество акций, выкуп которых он требует. УНП 100364117

## ОАО «Белпромтара»

**УВЕДОМЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**28 ноября 2016 г. в 14.00**

**по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 22, ком. 1.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белпромтара» и утверждении его в новой редакции.
2. Об утверждении уточненной сметы расходов ОАО «Белпромтара» на выплаты из прибыли на 2016 год».

УНП 100230455

## Извещение о реализации имущества ОАО «Барановичидрев» на первых торгах 20.12.2016 года

Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» Мищук А.М. проводит торги в форме аукциона по реализации объекта недвижимости.

Конт. тел. 8-029-6332490 vel.; (029)8248026 МТС; факс (0163)455124; E-mail: mischuk_am@mail

**Торги состоятся 20 декабря 2016 года в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.**

**ПРЕДМЕТ АУКЦИОНА**

### Комплекс зданий и сооружений объединенных в ЛОТ №2:

**1)** Объект недвижимости, капитальное строение с инв. №110/С-112496, площадью 13.623,3 кв.м, здание специализированное для обработки древесины и производства изделий, включая мебель, наименование – цех оконных блоков, расположенный на земельном участке с кадастровым №141000000003001974.

СТОИМОСТЬ: 563.000 рублей, без НДС.

**2)** Объект недвижимости, капитальное строение с инвентарным №110/С-104311, площадью 2.358,1 кв.м, здание административно-хозяйственное, наименование – бытовой корпус, расположенный на земельном участке с кадастровым №141000000003001974.

СТОИМОСТЬ: 329.000 рублей, без НДС.

**3)** Объект недвижимости, капитальное строение с инв. №110/С-111817, площадью 530,9 кв.м, здание неустановленного назначения, наименование – склад арочный, расположенный на земельном участке с кадастровым №141000000003001974.

СТОИМОСТЬ: 47.300 рублей, без НДС.

**4)** Объект недвижимости, капитальное строение с инв. №110/С-112253, площадью 452,5 кв.м, здание неустановленного назначения, наименование – склад арочный, расположенный на земельном участке с кадастровым №141000000003001974.

СТОИМОСТЬ: 40.300 рублей, без НДС.

**5)** Объект недвижимости, капитальное строение с инв.№110/С-112254, площадью 1.130,6 кв.м, здание неустановленного назначения, наименование – прирельсовый склад, расположенный на земельном участке с кадастровым №141000000003001974.

СТОИМОСТЬ: 90.900 рублей, без НДС.

Составные части ЛОТА №2:
- часть забора – 1040,4 м/п;
- асфальтовое покрытие – 2,234 кв.м;
- ворота.

**ОБЩАЯ СТОИМОСТЬ ЛОТА №2 – 1.070.500 рублей, без НДС.**

Победитель аукциона оплачивает стоимость Лота №2 в течение 3-х рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи.

Сумма задатка: 10% от начальной цены лота №2 в рублях РБ.

***Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с 3012122616138 в ф-ле ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Барановичи.***

Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.

Заявления на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, **в срок до 14 часов 00 минут 15.12.2016 г.** организатору торгов – председателю ликвидационной комиссии Мищуку А.М. по адресу: 225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

Более подробно с условиями аукциона можно ознакомится на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 20.11.2016 года.

***Председатель ликвидационной комиссии ОАО « Барановичидрев» А.М.МИЩУК***

## РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Покупай необходимое – выигрывай нужное»

ОСТРОВ ЧИСТОТЫ

**Организатор РИ**: Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг», УНП 590828925, зарегистрировано Приказом начальника главного управления юстиции Гродненского областного исполнительного комитета от 16.01.2008 №2-р.

**Местонахождение организатора РИ:** ул. Комсомольская, д. 42А, к. 1, 231335, Гродненская область, Ивьевский район, д. Липнишки, Республика Беларусь.

Почтовый адрес: 220068, ул. Каховская, д. 70а, пом. 8.

**Место и дата проведения розыгрыша:** 15 ноября 2016 года, г. Минск, ул. Сторожовская, 15, комната переговоров.

**Наименование рекламной игры:** рекламная игра называется **«Покупай необходимое – выигрывай нужное»**, проводилась в соответствии с условиями Правил, с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников игры платы.

**Срок начала и окончания рекламной игры:** 15.09.2016–15.12.2016 (включая период розыгрыша и вручения призов).

**Государственная регистрация РИ:** свидетельство № 2811 от 19.08.2016 МТ РБ.

**Количество участников РИ:** в розыгрыше участвовало 9653 единиц анкет участников игры. По итогам игры **«Покупай необходимое – выигрывай нужное»** разыгрывается призовой фонд, сформированный за счет собственных средств Организатора игры.

**Порядок проведения розыгрыша:** определение выигрышных номеров получателей призов происходит путем случайного вытаскивания анкет из барабана лототрона.

**Результаты розыгрыша:**

**Официальные результаты проведения рекламной игры «Покупай необходимое – выигрывай нужное» с указанием полного списка победителей приведены на сайте**

**www.ostrov-chistoty.by**

**Телевизор LED LG 40LF630V стоимостью 889,99 рублей и денежное вознаграждение в размере 118,19 рублей.**

| № п/п | № кассового чека | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|
| 1 | 00200286 | Шутова Ангелина Юрьевна |
| 2 | 0111 | Носко Нина Александровна |
| 3 | 00480035 | Олешкевич Дмитрий Иванович |
| 4 | 00620023 | Журавель Нина Дмитриевна |
| 5 | 00540359 | Сакевич Анастасия Евгеньевна |
| 6 | 00580042 | Майорова Дина Владимировна |
| 7 | 00490160 | Разумова Ж.А. |
| 8 | 00550032 | Кириенко Александр Константинович |
| 9 | 0208 | Рубец Ангелина Александровна |
| 10 | 0016 | Павленя Людмила Ивановна |
| 11 | 00550233 | Дрыжинская Е. |
| 12 | 00980193 | Мартынова Елена Ивановна |
| 13 | 00590201 | Шульгат Е.Г. |
| 14 | 0303 | Янусик Екатерина Александровна |
| 15 | и/м | Ольганец Марина Анатольевна |
| 16 | 01090194 | Лаптухова Мария Дмитриевна |
| 17 | 00850216 | Дремтюк Ю.А. |
| 18 | 00990246 | Жилевич Данил Владимирович |
| 19 | 00930309 | Переступняк Ирина Степановна |
| 20 | 0218 | Ремез Ольга Владимировна |

**Планшет Lenovo TAB 2 A8-50LC 16GBE-UA (ZA050008UA) стоимостью 300 рублей и денежное вознаграждение в размере 30,04 рублей**

| № п/п | № кассового чека | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|
| 1 | 0144 | Бабук Л.А. |
| 2 | 00220312 | Кушнер Юлия Николаевна |
| 3 | 01010268 | Кветкевич Екатерина Валерьевна |
| 4 | 01120055 | Василевич Юлия Сергеевна |
| 5 | 00920204 | Потонейко Виктория Витальевна |
| 6 | 00840032 | Суслокова Наталья Антоновна |
| 7 | и/м | Бондарчик Наталья Владимировна |
| 8 | 00570004 | Сивакова Анна Юрьевна |
| 9 | 00800066 | Алеткова Надежда Васильевна |
| 10 | 00680114 | Колб Татьяна Ивановна |
| 11 | 04030202 | Кудрявцева Екатерина Александровна |
| 12 | 00760024 | Борисов Александр Юрьевич |
| 13 | 0156 | Домарацкая Елена Александровна |
| 14 | 00090196 | Василевич Леонид Николаевич |
| 15 | и/м | Пашкова Ламара Малхазовна |
| 16 | 0053 | Островская Наталья Владимировна |
| 17 | 00940030 | Солушко Е.А. |
| 18 | 00840071 | Аникян А.Г. |
| 19 | 00500140 | Выликжанин Николай Владимирович |
| 20 | 00990068 | Поливко Татьяна Ивановна |
| 21 | 01020128 | Середа Вячеслав Николаевич |
| 22 | 00680318 | Бердник Александр Николаевич |
| 23 | 01130056 | Мандра Ирина Сергеевна |
| 24 | 01050282 | Селюжицкая Лилия Александровна |
| 25 | 00690124 | Зенькова Ольга Геннадьевна |
| 26 | 00600126 | Салсанова Наталья Олеговна |
| 27 | 00690293 | Вербицкая Алёна Юрьевна |
| 28 | и/м | Мачон Ольга Ивановна |
| 29 | 0218 | Шкодун Александр Анатольевич |
| 30 | 00710011 | Рощупкина Татьяна Михайловна |

**Электромобиль LW898Q (M101) стоимостью 341,00 рублей и денежное вознаграждение в размере 36,16 рублей.**

| № п/п | № кассового чека | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|
| 1 | 00990272 | Расстригина Наталья Викторовна |
| 2 | и/м | Корнеенко Ирина Александровна |

**Игрушка для катания детей типа электромобиль W458QG (A02) стоимостью 341,00 рублей и денежное вознаграждение в размере 36,16 рублей.**

| № п/п | № кассового чека | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|
| 1 | 01010058 | Мартынова Елена Ивановна |
| 2 | 00710050 | Кондратьев Станислав Владимирович |

**Детский электромобиль Sundays A061 BMW X5 черный стоимостью 537 рублей и денежное вознаграждение в размере 65,45 рублей.**

| № п/п | № кассового чека | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|
| 1 | 00750041 | Козлов Геннадий Иванович |

**Электромобиль Aero Black (2 мотора, 12 вольт) tero-7001 стоимостью 330 рублей и денежное вознаграждение в размере 34,52 рублей.**

| № п/п | № кассового чека | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|
| 1 | 00620096 | Летун Кирилл Геннадьевич |
| 2 | 00740028 | Лапошко Юлия Игоревна |

**Электромобиль Aero Blue (2 мотора, 12 вольт) tero-70010 стоимостью 330 рублей и денежное вознаграждение в размере 34,52 рублей.**

| № п/п | № кассового чека | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|
| 1 | 00990240 | Шоломицкий Игорь Михайлович |

**Электромобиль Aero White (2 мотора, 12 вольт) tero-70 стоимостью 330 рублей и денежное вознаграждение в размере 34,52 рублей.**

| № п/п | № кассового чека | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|
| 1 | 00570059 | Бирило Ольга Николаевна |

**Электромобиль Aero Yellow (2 мотора) tero-700 стоимостью 330 рублей и денежное вознаграждение в размере 34,52 рублей.**

| № п/п | № кассового чека | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|
| 1 | 0051 | Ленкевич Вероника Валентиновна |

**Мультиварка Redmond RMC-M4510 черная стоимостью 167 рублей и денежное вознаграждение в размере 10,16 рублей.**

| № п/п | № кассового чека | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|
| 1 | 00560094 | Степура Лариса Олеговна |
| 2 | 00730212 | Михеев Сергей Васильевич |
| 3 | 00880052 | Урбан Юлия Сергеевна |
| 4 | 01070009 | Зинченко Елена Викторовна |
| 5 | 00840065 | Дяктерёва Виктория Александровна |
| 6 | 02760273 | Говоров Виктор Григорьевич |
| 7 | 00890062 | Бердникова Юлия Николаевна |
| 8 | 0065 | Корзун Анатолий Александрович |
| 9 | 01080118 | Соколова Екатерина Владимировна |
